Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

24 ЖНІЎНЯ 2022 г.
СЕРАДА
№ 165 (29787)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

БЕЛАРУСЬ — РАСІЯ: ШТО ПАКАЗАЛА САЦДАСЛЕДАВАННЕ 3

ЯКІХ ЖЫВЁЛ НЕЛЬГА ТРЫМАЦЬ У ДОМЕ? 5

ЦЫТАТА ДНЯ

Раман ГАЛОЎЧАНКА, прэм'ер-міністр Беларусі:

«Па аб'ёмах экспарту мы прасядаем за кошт тройкі-чацвёркі экспарцёраў, якія трапілі пад найбольшы санкцыйны прэс. Лічу, што самы складаны час ужо мінуў — пачынаючы з мая, экспарт стабільна прырастае. Самае галоўнае, што яго заўсёды трэба ацэньваць у балансе гандлёвага сальда, якое паляпшаецца. Думаю, што па выніках года ў нас наогул будзе рэкорднае дадатнае сальда. Гэта звязана са скарачэннем імпарту і ростам экспарту. Але гэта вельмі важна для плацежнага балансу краіны: прыток валюты будзе дастатковы для таго, каб умацоўваць рэзервы і забяспечваць усе нашы плацежныя абавязацельствы».

Спадчына Чарніцкага

У былым **пасёлку торфараспрацоўшчыкаў Чарніцкі Смалявіцкага раёна** ўстаноўлены і адкрыты помнік землякам — удзельнікам Вялікай Айчыннай вайны. Праект, распрацоўку і будаўнічыя работы манумента ажыццявілі энтузіясты — сябры аматарскага самадзейнага калектыву «Спадчына», які дзейнічае на працягу дзясятка гадоў пры пасялковым клубе.

У мінулую суботу адкрыццём помніка пачыналася свята населенага пункта, якому, калі верыць гістарычным дакументам, дзвесце дзесяць гадоў. На ўрачыстую цырымонію прыехалі прадстаўнікі грамадскіх арганізацый раёна, выхадцы і нашчадкі колішніх жыхароў, артысты мінскіх тэатраў, прыйшлі пенсіянеры з унукамі, моладзь. У людзей быў асаблівы настрой — узнёсла і радасна свяціліся іх твары, з гонарам у руках яны неслі букецікі кветак, каб пакласці іх да п'едэстала. Былі ўсхваляваныя прамовы, падзякі і падарункі рупліўцам — камандзе «Спадчына», якая (і дарослыя, і дзеці) у гэты дзень была апранута ў ваенную форму часоў вайны і стварала непаўторную атмасферу.

Такіх значных і па-сапраўднаму гістарычных момантаў у жыцці пасёлка яшчэ не было. Пра важнасць захавання памяці і ўшанавання подзвігу землякоў, пра неацэнную духоўную спадчыну казалі загадчык клуба і кіраўнік аб'яднання «Спадчына» Юрый Сапёраў і мясцовы святар, айцец Міхаіл Барашка, які малітваю асвяціў новы абеліск. А потым быў канцэрт з песнямі, што ўзрушвалі памяць і нагадвалі пра час маладосці пакалення, на долю якога выпала вайна...

СТАР. 13

Жніво-2022

На Міншчыне — першыя пяцітысячнікі

На Міншчыне з'явіліся першыя камбайнеры-пяцітысячнікі. Імі сталі Сяргей МАКСІМЕЦ і Васіль ЗУР, якія працуюць у адкрытым акцыянерным таварыстве «Крутагор'е-Петкавічы» Дзяржынскага раёна.

Адметна, што столькі збожжа — пяць тысяч тон — яны сабралі менавіта на айчынным КЗС 2124 КР гомельскай вытворчасці.

СТАР. 2

Прыёмная кампанія — 2022

БАРАЦЬБА ЗА АБІТУРЫЕНТА

Як сумясціць заяўкі заказчыкаў кадраў з інтарэсамі выпускнікоў?

Прыёмная кампанія ў ВНУ распачынаецца не ў ліпені, і нават не ў маі, калі адкрываюцца пункты рэгістрацыі на ЦТ. Яна стартуе літаральна на наступны дзень пасля закрыцця прыёмных камісій.

Фота bsgu.by

Для таго каб прыцягнуць на вучобу добра падрыхтаваных і матываваных абітурыентаў, патрабуецца карпатлівая мэтанакіраваная прафарыентацыйная работа. Гэта добра разумеюць у рэгіянальных ВНУ, бо ім даводзіцца канкурыраваць за сваіх абітурыентаў са сталічнымі ўніверсітэтамі.

СТАР. 6

КАРОТКА

- Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў народ Украіны з Днём Незалежнасці.
- **У Магілёўскай вобласці пачала працаваць першая пляцоўка па рэалізацыі прадукцыі лясгаспадаркі, у тым ліку піламатэрыялаў, дроў, мёду, лазневых венікаў, тушанага мяса лася.**
- Дзень агурка адсвяткуюць у Шклове 27 жніўня.
- **Замену вонкавых свяцільняў на святлодыёдныя ў вёсках плануюць завяршыць да 2026 года.**
- У Беларусі пачасціліся спробы перасылаць замежную валюту міжнароднай поштай.

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СА «ЗВЯЗДОЙ» ЦЯПЛЕЙ І ЎТУЛЬНЕЙ!

Ідзе падпіска на IV квартал 2022 года.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ ВОСЕННЮ І ЗІМОЙ. БУДЗЕ ЦІКАВА!

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«СПРАВЯДЛІВАЕ СТАЎЛЕННЕ ДА КОЖНАГА І ЗАБЕСПЯЧЭННЕ РОЎНЫХ МАГЧЫМАСЦЯЎ»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў нараду, прысвечаную нацыянальнай сістэме адукацыі. Такія сустрэчы традыцыйна праводзяцца напярэдадні Дня ведаў, каб зверыць гадзіннікі, заслухаць даклады аб гатоўнасці да новага навучальнага года. Аднак сёлета сустрэча прайшла ў зменены фармаце. На нараду было запрошана больш шырокае кола адказных і зацікаўленых асоб, якія ведаюць сістэму адукацыі, як той казаў, знутры.

«Такое рашэнне прынята ў сувязі з тым, што ў пачатку года мы значна абнавілі Кодэкс аб адукацыі і правілы прыёму ў тэхнікумы і ВНУ. Цяпер праводзіцца сур'ёзная карэкціроўка заканадаўства, прайшла ў абноўленым фармаце ўступная кампанія. Як прайшла гэтая кампанія і, галоўнае, якія яе высновы, як будзем рухацца далей? Асноўныя нововвядзенні, у адпаведнасці з Кодэксам і правіламі прыёму, плануюцца з 2023 года. Ужо хутка, фактычна з пачаткам навучальнага года, мы дадзім старт новай уступнай кампаніі», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён пацікавіўся ў прысутных, якая гатоўнасць сістэмы адукацыі, мясцовых органаў улады, вышэйшай школы да гэтых нововвядзенняў.

«Вы ведаеце, што галоўны прынцып маёй палітыкі ў адукацыі — справядлівае стаўленне да кожнага чалавека і забеспячэнне роўных магчымасцяў для навучання. Праўда, я так падумаў над гэтым тэзісам і зрабіў вывад, што, як ніколі раней, такія магчымасці ёсць. У першую чаргу гэта датычыцца мэтавага накіравання хлопцаў і дзяўчат для навучання ў ВНУ. Мэтавае прызначэнне — гэта вялікая льгота, і тыя, хто нядрэнна займаўся ў школе, маюць магчымасць паступіць у ВНУ», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт зрабіў акцэнт на тым, што настаўнікі, выпускнікі і іх бацькі павінны дакладна ведаць усе правілы, каб рэалізаваць сваё канстытуцыйнае права на атрыманне адукацыі. Ён нагадаў, што на мінулай нарадзе, прысвечанай адукацыі, у лістападзе 2021 года Ігар Карпенка, тады міністр адукацыі, дакладваў аб прыярытэтных напрамках развіцця галіны, якія ў цэлым былі падтрыманы. Новы міністр, Андрэй Іванец, атрымаў добры задзел. Але па асобных пытаннях у яго ёсць сваё меркаванне. Па словах Прэзідэнта, гэта нядрэнна.

«Мне вельмі важна пачуць аб вашым бачанні сітуацыі ў сістэме, яшчэ раз абмеркаваць рэалізацыю новых падыходаў да арганізацыі навучальнага працэсу, выніковай атэстацыі выпускнікоў школ, грамадзянска-патрыятычнага выхавання дзяцей і моладзі. Таксама трэба разгледзець праблемныя пытанні. Улічаны, што такія ёсць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён падкрэсліў, што калі ёсць нейкія сумненні ў прынятых рашэннях ці патэнцыяльныя праблемы, іх трэба неадкладна вырашаць.

Цяперашнія вынікі і будучыя навацыі

Прэзідэнт сарыентаваў удзельнікаў нарады на тое, што апісальны метад не падыходзіць. Галоўнае — гэта вывады.

Намеснік прэм'ер-міністра Ігар Петрышэнка далажыў, што сёлетняя ўступная кампанія прайшла спакойна. Былі ўлічаны некаторыя пажаданні абітурыентаў і іх бацькоў. Напрыклад, максімальна задзейнічалі выхадныя дні і павялічылі час на выкананне тэстаў па матэматыцы і фізіцы да трох з паловай гадзін. Дарэчы, сёлета павялічылася колькасць абітурыентаў, якія здавалі тэсціраванне па фізіцы і матэматыцы. Па словах Ігара Петрышэнкі, гэта звязана як са з'яўленнем новых актуальных спецыяльнасцяў, так і з ростам попыту на рынку працы спецыялістаў з інжынернай адукацыяй. Намеснік прэм'ер-міністра расказаў, што абсалютны вынік у 100 балаў паказалі 337 абітурыентаў. А выпускніца сярэдняй школы № 8 горада Ліды Анастасія Більдзь паказала такі вынік па трох прадметах. Яна — выпускніца Нацыянальнага дзіцячага тэхнапарка. «Гэта яшчэ раз пацвярджае правільнасць рашэння аб стварэнні дзіцячага нацыянальнага тэхнапарка і прадаўжэнні работы, сістэмных мер па выяўленні адораных навучэнцаў у кожным рэгіёне і іх суправаджэнні па прафесійнай арыентацыі», — адзначыў Ігар Петрышэнка.

Увогуле сёлета сітуацыя з прыёмам у ВНУ палепшылася. Вакантнымі засталіся 86 бюджэтных месцаў па пяці спецыяльнасцях. Былі павялічаны кантрольныя лічбы набору на дзённую форму навучання па спецыяльнасцях медыцынскага, тэхналагічнага і педагагічнага профіляў.

Ужо ў 2023 годзе фармат уступнай кампаніі можа змяніцца. Ключавой навацыяй можа стаць сумяшчэнне школьных выпускных экзаменаў па матэматыцы і адной з дзяржаўных моў з цэнтралізаваным тэсціраваннем. Мяркуецца, што гэта дапаможа ўбачыць зрэз ведаў усіх выпускнікоў школ, незалежна ад таго, паступаюць яны ва ўніверсітэты ці не.

Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што форма такога экзамену — галоўнае пытанне для абітурыентаў і бацькоў. Ды і для выкладчыкаў. «Мы хочам атрымаць з вышэйшай адукацыяй не толькі адукаванага чалавека, прынамсі, на першай стадыі, але і сапраўднага чалавека, патрыёта», — рэзюмаваў ён.

Валерыя СЦЯЦКО.

У тэму

ТРЭБА ЗАГАДЗЯ БАЧЫЦЬ СПЕЦЫЯЛІСТА

Пасля нарады з кіраўніком дзяржавы **намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА** расказаў журналістам, што на парадак дня таксама былі вынесены задачы матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння, пытанні бяспекі знаходжання, гатоўнасці вучняў, іх бацькоў да новага навучальнага года. «Мы абмяркоўвалі праблематыку арганізацыі харчавання. Кіраўнік дзяржавы акцэнтаваў увагу на неабходнасці дакладнай і рацыянальнай работы ўсіх органаў і структур на месцах. Абмяркоўвалася таксама праблематыка занятасці дзяцей у шосты школьны дзень, каб не было фармалізму. І, вядома ж, пытанні, звязаныя з арганізацыяй методыкі выкладання, з тым, каб мы пастаянна ўдасканальвалі падручнік», — сказаў ён.

Асобна намеснік прэм'ер-міністра звярнуў увагу на рэалізацыю з наступнага навучальнага года новых падыходаў да правядзення цэнтралізаванага экзамену, цэтралізаванага тэсціравання. «Мы павінны загадзя бачыць спецыяліста са школьнай лавы і весці яго ў тую прафесію, у якой ён зможа якасна сябе рэалізаваць», — адзначыў ён.

Міністр адукацыі Андрэй ІВАНЕЦ расказаў, што галоўная задача, пастаўленая Прэзідэнтам, — справядлівы адбор абітурыентаў, якія будуць матываванымі на вучобу ва ўніверсітэце і далейшую работу ў рэальным сектары эканомікі.

«Гэта вельмі складанае пытанне, наша краіна на працягу шэрагу гадоў ішла па шляху ўвядзення цэнтралізаванага тэсціравання. Сёння прыйшоў час адказаць на пытанне, наколькі добра гэтая сістэма спрацавала, якіх патрабуе карэкціровак. У сувязі з гэтым пастаўлены канкрэтныя, сцісłыя тэрміны — да новага года — унесці канкрэтныя прапановы: або мы захоўваем цяперашнюю сістэму, або ўводзім неабходныя навацыі. Усё развіваецца вельмі дынамічна, вядома, гэтыя прапановы, якія будуць выпрацаваны і ўнесены на разгляд кіраўніка дзяржавы, могуць закрануць і чарговую ўступную кампанію», — сказаў ён.

Міністр падкрэсліў, што пытанне правядзення цэтралізаванага экзамену ўжо вызначана. Іншае пытанне, што цэтралізаваны экзамен — усяго толькі элемент уступнай кампаніі, і ў сувязі з гэтым трэба разгледзець, якім ён павінен быць і якія яшчэ дадатковыя ўступныя іспыты могуць быць у кожным канкрэтным універсітэце ці групе ўніверсітэтаў.

На Міншчыне — першыя пяцітысячнікі

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

На жніве хлопцы не навічкі, працуюць на хлебнай ніве больш як дваццаць гадоў. Але сёлета ім давялося папрацаваць у адным экіпажы ўпершыню. Як расказалі пяцітысячнікі, за тры тыдні з пачатку ўборкі прайшлі 900 гектараў поля. Сяргей Максімец у першы раз працуе на камбайне гэтай маркі, а яго калега Васіль Зур добра ведае ўсе асаблівасці машыны, паколькі за штурвалам такога камбайна не першы год. Мужчыны адзначаюць, што кіраваць камбайнам — адно задавальненне, ён просты ў рабоце, абсталяваны ўсім неабходным: кандыцыянерам, халадзільнікам. Кормяць, дарэчы, камбайнераў выдатна, два разы на дзень, у тым ліку і паўнавартаснымі гарачымі абедамі, якія прывозяць у поле спецыяльна абсталяваны машынай.

— Кожны каласок цяпер на ўліку, таму што збожжа сёння на вагу золата. І мы ўважліва сочым, каб ні адно зярнятка не ўпала на зямлю, а трапляла ў бункер, — кажуць камбайнеры.

Першых пяцітысячнікаў у Мінскай вобласці прыехаў павіншаваць **першы намеснік старшыні Мінаблвыканкама Сяргей ЛЯЎКОВІЧ.**

Фота БелТА

Першы намеснік старшыні Мінаблвыканкама Сяргей ЛЯЎКОВІЧ віншуе камбайнера Сяргея МАКСІМЦА.

— Пяць тысяч намалоту — гэта падстава для гонару. Гонару за нашу беларускую тэхніку, нашых камбайнераў. Гэта адданыя сваёй працы людзі, якія робяць найцяжэйшую работу, — лічыць Сяргей Ляўковіч. — Нялёгка на адным камбайне намалаціць столькі збожжа і замахнуцца на шэсць тысяч тон. У нас моцныя людзі, моцныя механізатары працуюць у сельскай гаспадарцы.

Па словах Сяргея Віктаравіча, сёлета на Міншчыне вялікая колькасць тысячнікаў, лік ідзе на сотні. Дзясяткі экіпажаў намалацілі па дзве, тры тысячы тон. Гэты год для многіх сельгасарганізацый будзе рэкордным па намалотах. Ураджайнасць сёлета вышэйшая, чым летась, практычна па ўсіх сельгаскультурах. «Збожжавых мы атрымаем дакладна больш. Перавысілі мінулагодні рубеж і па ўраджайнасці рапсу. На ўчарашні дзень у вобласці ўбрана 87 % плошчаў. Несумненна, што з улікам зерня кукурузы будзе рэкорд. Нам неабходна ўбраць кукурузу на плошчы 280 тысяч гектараў. Гэта самыя вялікія пасевы за ўсю гісторыю Мінскай вобласці. Міншчына будзе цалкам забяспечана зернем, як для жывёлагадоўлі, так і для выпечкі хлеба».

Сяргей Ляўковіч дадаў, што ў цэнтральным рэгіёне пасеяна звыш паловы азімага рапсу, назапашваюцца мінеральныя ўгнаенні, што дасць магчымасць з захаваннем тэхналогій пасеяць азімыя збожжавыя культуры. Менавіта на іх робіцца стаўка.

У завяршэнне ён уручыў Сяргею Максімцу і Васілю Зуру падарункі — бытавую тэхніку.

Спецыяльна на поле прыехаў і **намеснік генеральнага дырэктара «Гомсельмаша» Віктар СЛАВАШЭВІЧ,** які падзякаваў камбайнерам ад імя завадчан і ўручыў грашовыя прэміі і сертыфікаты на адпачынак у санаторыі. «Хто добра працуе, павінен добра адпачываць. Дзякуй за тое, што паказалі, на што здольная наша тэхніка, не горшая за замежную», — падкрэсліў ён.

Ад імя ўсяго калектыву перадавікоў жніва павіншаваў і **дырэктар ААТ «Крутагор'е-Петкавічы» Юрый КЛІМАШ,** які канстатаваў, што за першыя пяцьсот і тысячу тон намалочанага зерня камбайнерам і вадзіцелям на адвозцы прафкам і адміністрацыя гаспадаркі ўручаюць прэміі. Юрый Пятровіч адзначыў, што сёлета ў акцыянерным таварыстве намалацілі 24 тысячы 900 тон зерня, што на пяць тысяч больш як летась, ураджайнасць склала 56 цэнтнераў з гектара. Праз два-тры дні ўборка завершыцца.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

Чулі?

Прадоўжаны перыяд абмену банкнотаў узору 2000 года

У Беларусі ўстанаўліваецца дадатковы перыяд абмену грашовых знакаў узору 2000 года на грашовыя знакі ўзору 2009 года, паведамілі БелТА ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацыянальнага банка.

Адпаведнае рашэнне зменшчана ва ўказе Прэзідэнта ад 22 жніўня 2022 года нумар № 293 «Аб змяненні ўказаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь».

Выведзеныя з абарачэння купюры будуць прымацца з 1 верасня 2022 года па 31 снежня 2024 года ў прыходна-расходных касах Нацыянальнага банка, размешчаных па адрасе: г. Мінск, вул.Талстога, 6.

Абмен банкнотаў узору 2000 года на банкноты і манеты ўзору 2009 года будзе ажыццяўляцца без абмежаванняў і без спагнання ўзнагароджвання ў адпаведнасці з устаноўленым маштабам дэнамінацыі ў суадносінах 10000:1 (у суадносінах Br10 000 у грашовых знаках узору 2000 года і Br1 у грашовых знаках узору 2009 года).

Абменьвацца будуць банкноты ўзору 2000 года наміналамі ад Br100 і вышэй. Звязана гэта з тым, што банкноты ўзору 2000 года наміналамі ад Br1 да Br50 уключна ў перыяд дзеяння Указа ад 4 лістапада 2015 года № 450 «Аб правядзенні дэнамінацыі афіцыйнай грашовай адзінкі Рэспублікі Беларусь» не абменьваюцца.

САЦДАСЛЕДАВАННЕ: БОЛЬШАСЦЬ БЕЛАРУСАЎ ДОБРА СТАВІЦЦА ДА РАСІЙСКАЙ ФЕДЭРАЦЫІ

Як ужо паведамлялася, у перыяд з 22 ліпеня па 12 жніўня 2022 года па заказе БелТА Аналітычным цэнтрам EcooM праведзена сацыялагічнае даследаванне «Сацыяльнае мысленне пад санкцыйным рэжымам». Апытана 1560 рэспандэнтаў у населеных пунктах усіх рэгіёнаў Беларусі з выкананнем прынцыпу рэпрэзентатыўнасці для насельніцтва Беларусі ад 18 гадоў па палавой прыкмеце, узросце, занятасці, тыпе населенага пункта і рэгіёне пражывання рэспандэнтаў.

Рэспандэнтам прапаноўвалася адказаць і на пытанне: **«Як вы ставіцеся да Расійскай Федэрацыі?»**

«Добра» — так адказалі 56,8 % беларусаў, «хутчэй добра» — 12,9 %, «дрэнна» — 1,5 %, «хутчэй дрэнна» — 0,9 %.

ЯК ВЫ СТАВІЦЕСЯ ДА РАСІЙСКАЙ ФЕДЭРАЦЫІ?



«У гэтых адказах мы не толькі бачым стаўленне грамадзян нашай краіны да Расійскай Федэрацыі як дзяржавы, але і міжасобасныя адносіны на ўзроўні людзей. Я б звярнуў увагу на адказы «дрэнна» і «хутчэй дрэнна» — 1,5 працэнта і 0,9 працэнта адпаведна — нават 3 % няма. Тут хацелася б акцэнтаваць, што гэтае пытанне задавалася пасля паўгода спецаперацыі Расіі ва Украіне. Па сутнасці, гэта не проста ацэнка нашых эканамічных, палітычных, культурных, іншых адносін з РФ і адносіны да яе палітыкі. У тым ліку і адносіны да спецыяльнай ваеннай аперацыі. Таму цікавыя звесткі, якія пра многае гавораць», — сказаў **Сяргей МУСІЕНКА, кіраўнік Аналітычнага цэнтра EcooM.**

«Нейтральна» — такі адказ далі 20,6 % рэспандэнтаў. Не змаглі адказаць — 2,2 %, няма адказу — у 5,1 %. «Па вялікім рахунку, тое, што адбываецца ў нашых суседзяў, — гэта спецыяльная, але ваенная аперацыя. Гінуць людзі, дзеці. Ёсць розныя сітуацыі, сюжэты. Я нават стаўлюся да нейтральнай пазіцыі з разуменнем. Давайце разбяромся, зразумеем. Ужо ў Расіі пачалі гінуць ад тэрарыстычных актаў дзеці вучоных, палітыкаў, — адзначыў кіраўнік Аналітычнага цэнтра EcooM. — Ведаеце, адзін з любімых у сацыялогіі момантаў, калі не прама задаеш пытанне. Тут няма пытання аб адносінах да спецыяльнай ваеннай аперацыі. Але, па сутнасці, мы на яго атрымліваем адказ, згадзіцеся. У цэлым бачым да гэтага адносіны».

Беларусам таксама **прапанавалі ацаніць цяперашнія міждзяржаўныя адносіны Беларусі і Расіі.**

Добрымі, добрасуседскімі іх лічаць 52,6 % беларусаў, хутчэй добрымі — 27,2 %. «Наколькі добрыя, настолькі і дрэнныя» — так адказалі 9,6 працэнта рэспандэнтаў, «хутчэй напружаныя, дрэнныя» — 1,5 працэнта. Не змаглі адказаць — 8,6 %, няма адказу — у 0,5 %.

«Тут мы таксама бачым дакладны і ясны адказ. Большасць людзей разумее, што калі б не нашы сённяшнія адносіны, узровень даверу з Расіяй, калі б, крый божа, у 2020 годзе мы завагаліся, мы атрымалі б «прылёты» і да нас. Таму гэта комплексная ацэнка работы ўлады, дзяржавы, урада, Адміністрацыі Прэзідэнта, — падкрэсліў Сяргей Мусіенка. — «Наколькі добрыя, настолькі і дрэнныя» — 9,6 працэнта. Вы ведаеце, ёсць такі вядомы сацыёлаг Яўген Капацько. Мы з ім гэтае даследаванне распрацоўвалі, кансультаваліся. Ён гэтую фармулёўку прымяніў. Яна для нас крыху нетыповая. «Наколькі добрыя, настолькі і дрэнныя» — тут у людзей ёсць пэўны элемент нявызначанасці. Мы прыслухаемся, паглядзім, вывучым. Разам з тым мы бачым, што фактычна 80 % лічаць, што — «добрыя, добрасуседскія» і — «хутчэй добрыя». Гэта безумоўная ацэнка той шматгадовай работы, якую мы праводзім. І аснова таго, што цяпер у нас ёсць у многім, у тым ліку і добрасуседскія адносіны з РФ. Тое, што мы моўныя пытанні своечасова вырашылі, і на народным рэферэндуме, заўважце. Гэта значыць, калі б ва Украіне быў праведзены рэферэндум у адносінах да Расійскай Федэрацыі і мовы, іншых галоўных пытанняў, якія мы ставілі на рэферэндум, то сённяшняй сітуацыі не было б. Я ў гэтым больш чым упэўнены. Вось гэты адказ яскрава пра тое гаворыць. Таму што «хутчэй напружаныя, дрэнныя» — мае нікчэмна малую частку.

Заўважце, вельмі маленькая частка — «няма адказу». Гэта значыць з гэтым важным пытаннем дакладнасць ёсць дакладная. І гэта пазіцыя людзей і дзяржавы. Тут поўная адпаведнасць таму, што мы робім, як мы развіваем адносіны і як мы рухаемся».

Яшчэ адно пытанне, зададзенае ўдзельнікам сацдаследавання: **«Як вы ставіцеся да санкцый калектыўнага Захаду супраць Беларусі і Расіі?».**

«Негатыўна» — так адказалі 61,4 % беларусаў, «хутчэй негатыўна» — 17,9 %, «нейтральна» — 8,2 %. Пазітыўна ўспрымаюць санкцыі 1,9 працэнта рэспандэнтаў, хутчэй пазітыўна — 0,6 працэнта.

ЯК БЫ ВЫ АЦАНІЛІ ЦЯПЕРАШНІЯ МІЖДЗЯРЖАЎНЫЯ АДНОСІНЫ БЕЛАРУСІ І РАСІІ?



«Гэта асобная тэма. Наогул цяжка сказаць, як можна пазітыўна ставіцца да таго, што парушаюць твае правы, абмяжоўваюць, забараняюць. Мы дзясяткі гадоў чулі з боку Захаду пра свабоду слова, выказвання, але сёння нават няма свабоды перамяшчэння, не кажучы ўжо пра закрыццё шэрагу Telegram-каналаў, TV-каналаў. Як можна да санкцый пазітыўна ставіцца? І хочацца паглядзець у твар тым людзям, якія ўспрымаюць санкцыі «пазітыўна» і «хутчэй пазітыўна». Іх няшмат, але ёсць такая катэгорыя, і мы таксама павінны гэта ўлічваць, — адзначыў кіраўнік Аналітычнага цэнтра EcooM. — Хоць тут таксама ёсць такая даволі складаная дылема. Наша дзяржава, урад робіць вельмі шмат, каб мы не адчулі гэтых санкцый. Гэта значыць, не толькі ад таго, што іх няма. Яны ёсць, але робіцца дзяржавай вельмі шмат, каб мы іх не адчулі. І некаторыя людзі лічаць, што, па сутнасці, ніякіх санкцый і няма. Бо ёсць і пазітыўны элемент у санкцыях, на мой погляд, які мабілізуе дзяржаву, людзей, павінен мабілізаваць прамысловасць. І, на вялікі жаль, мы не бачым той мабілізацыі прамысловасці і фінансавага сектара ў РФ, якая павінна быць, шчыра кажучы. Праз колькі сутак быў створаны ў нас Каардынацыйны савет пры Савеце Міністраў па рэагаванні на ўзмацненне санкцый? Літаральна ў першыя трое сутак. А дзе ён у Расіі? І ці ёсць ён увогуле тэарэтычна? Але ж адбылося рабаванне стагоддзя. Узялі і замарозілі або прысвоілі актывы на суму больш за $500 млрд — прыватных, дзяржаўных, прадпрыемстваў. Разбой. Без суда і следства замарожаныя яхты, дамы, грошы, у тым ліку алігархаў. Мы ўсё гэта бачылі. А магутнай эканамічнай рэакцыі фінансавага блока РФ няма да гэтага часу ў належнай меры. Пра гэта гавораць многія эканамісты. Таму што моц Расійскай Федэрацыі не сувымерная па эканамічных складніках з тым адказам, які адбыўся».

Але ў той жа час мабілізацыя эканомікі — гэта пазітыўна для нас, працягнуў Сяргей Мусіенка. «І мы тое разумеем. Імпартазамяшчэнне пазітыўнае для нас. Расія толькі пачынае займацца імпартазамяшчэннем, мы ўжо ім займаемся больш як 20 гадоў. Таму мы гэтыя рэчы шмат у чым ведаем, як вырашаць, і робім», — адзначыў ён.

Не змаглі адказаць на пытанне 9,5 % рэспандэнтаў, няма адказу — у 0,5 %. Гэта паказчык таго, што людзі проста не адчулі на сабе ўплыў заходніх санкцый.

«Выразная работа ўлады і ўрада па многіх напрамках прыводзіць да таго, што людзі не заўважаюць на сабе негатыўнага ўплыву санкцый. Тавары ў магазінах ёсць, адзенне, ежа, цяпло ёсць. У чым змянілася наша з вамі жыццё за апошнія паўгода — у снежні і цяпер? Па сутнасці, ніяк. Людзі так і адказалі: не ведаю, ці ёсць наогул гэтыя санкцыі. Хоць яны беспрэцэдэнтныя ў сусветным маштабе, — сказаў кіраўнік Аналітычнага цэнтра EcooM. — Заўважце, вельмі важны момант. Санкцыі накіраваны канкрэтна супраць беларускага і расійскага народаў, не толькі супраць кіраўнікоў. І гэта моцна адрозніваецца ад таго, што было да гэтага часу. Тады яны былі кропкава накіраваныя супраць кіраўнікоў і не працавалі. Цяпер іх накіравалі супраць усіх нас — і яны працуюць па ініцыятарах. На Захадзе пачынаюць разумець, што накіравалі санкцыі супраць сябе. Гэта гаворыць пра адмоўны адбор заходніх эліт, у іх была метадычка, напісаная іх дзядамі, яны яе выконвалі, але аказалася, што трэба было мозг уключаць часам і карэкціраваць. А калі мозгу няма? Любы эканаміст, любы аналітык гэта зразумеў бы. А яны працягваюць санкцыі і ўжо наступныя абмяркоўваюць. Дэградацыя эліт на Захадзе адбылася. Яны не разумеюць наступстваў сваіх дзеянняў».

ЯК ВЫ СТАВІЦЕСЯ ДА САНКЦЫЙ КАЛЕКТЫЎНАГА ЗАХАДУ СУПРАЦЬ БЕЛАРУСІ І РАСІІ?

А для Беларусі і Расіі санкцыі ў выніку адкрылі новыя магчымасці. «Мы адкрылі новыя рынкі. Калі б раней мы працавалі з Кітаем так, як сёння, уяўляеце, наколькі б магутным было ўзаемадзеянне — калі б пачалося гэта ўсё ў 2010, 2018 гадах. Так, мы прысутнічалі на рынках, але ўваход нашых прадуктаў харчавання... Мэбельшчыкі нашы радуюцца аб'ёмам кітайскага рынку і гэтак далей. Так, гэта і сертыфікацыя, якую мы своечасова прайшлі і ў патрэбны момант аказаліся на рынку запатрабаванымі. І мы выкарыстоўвалі магчымасці, якія адкрыліся, — дапоўніў Сяргей Мусіенка. — Цяпер, на мой погляд, пачынаецца рэальнае спаборніцтва эканамічных сістэм, таму што на працягу дзесяцігоддзяў пасля распаду Савецкага Саюза на Расіі паразітавала Еўропа, штучна занізіўшы цэны на энергарэсурсы. Заўважце, гэта рынак адрэгуляваў цану на газ сёння, якая перавышае $2 тысячы. А да гэтага газ па кантрактах быў у раёне $200—300. Гэта значыць, штучна прыніжалі, а потым прадавалі ў сябе і, па сутнасці, абкрадалі расійскі народ і прадпрыемствы, не даючы ім развівацца. Давалі абагачацца алігархам, якіх потым і «экспрапрыіравалі». Дзясяткі гадоў не давалі нармальна развівацца. Казалі, гэта нічога не варта, мы возьмем у іншым месцы. А сёння аказалася, што не асабліва і возьмеш газ, нафту, хлеб. Дык вось, давайце садзіцца і размаўляць, але і размаўляць не могуць і пакуль не жадаюць. Зваротны эфект ад санкцый і культурных, і эканамічных, і палітычных мы цяпер назіраем. Але гэта і ўзровень адукацыі тых людзей, якія іх уводзілі. Вось гэтая хвалёная адукацыя па Балонскім працэсе прывяла да таго выніку, які мы цяпер бачым. Людзі не разумеюць прычынна-выніковых сувязяў. Нам усё гэта зразумела, нашы людзі гэта бачаць, і вельмі прыемна, што такая ацэнка практычна ў 80 % беларусаў».

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Узровень запасаў газу ў сховішчах Еўропы перавысіў максімальны паказчык 2021 года

Узровень запасаў газу ў падземных сховішчах (ПСГ) краін Еўропы перавысіў максімальны паказчык мінулага ацяпляльнага сезона зімы 2021—2022 гадоў. Аб гэтым паведамляе ТАСС са спасылкай на данныя Gas Infrastructure Europe.

Так, на стане на 21 жніўня, запасы газу ў еўрапейскіх ПСГ павялічыліся да 77,42 % — гэта на 0,19 працэнтнага пункта вышэй у параўнанні з аналагічным перыядам за апошнія пяць гадоў. Цяпер у сховішчах сабрана каля 83,3 млрд куб. м газу. Летась максімум запаўнення сховішчаў назіраўся 21 кастрычніка — крыху больш за 83 млрд куб. м (77,28 %). Раней газета «Известия» паведамляла, што цана на газ у ЕС можа дасягнуць $4 тысяч у верасні.

Напярэдадні стала вядома, што Германія запоўніла свае падземныя сховішчы газу ўжо на 80 % і будзе працягваць запампоўванне далей.

Мядзведзеў: гарантыі бяспекі Кіеву магло даць пагадненне з РФ, але ён адмовіўся

Намеснік старшыні Савета бяспекі Расіі Дзмітрый Мядзведзеў заявіў: прамым вынікам спецыяльнай ваеннай аперацыі ва Украіне з'яўляецца тое, што гэтую краіну не прымуць у НАТА.

«Усім жа зразумела, што ніякія суседзі ім ніякіх гарантый даць не могуць, нават калі люта ненавідзяць Расію. А ў НАТА Украіну цяпер ніхто не прыме. У Альянсе хоць і русафобы, але не самазабойцы. І гэта прамы вынік спецыяльнай ваеннай аперацыі», — напісаў палітык у сваім Telegram-канале. Паводле яго слоў, гарантыі бяспекі магло даць толькі пагадненне з Расійскай Федэрацыяй, аднак Кіеў, атрымаўшы грошы і ракеты ад Захаду, ад яго адмовіўся.

«Кіеўскі рэжым разумее, што менавіта для яго (цяперашніх кіраўнікоў Украіны) ніякіх гарантый бяспекі ўвогуле няма і быць не можа».

У Швейцарыі занадта хутка растаюць леднікі

Новае даследаванне ў галіне вывучэння клімату паказала, што раставанне ледніковў у Швейцарыі ў апошнія гады паскорылася, перадае Associated Press.

Швейцарская вышэйшая тэхнічная школа Цюрыха і Швейцарскі федэральны навукова-даследчы інстытут лесу, снегу і ландшафту ў панядзелак расказалі аб выніках першай у гісторыі рэканструкцыі страты лёду ў Швейцарыі ў XX стагоддзі. Паводле даследчых даных, каля 1400 ледніковў Швейцарыі страціла больш за палову свайго агульнага аб'ёму з пачатку 1930-х гадоў да 2016 года. Далей, усяго за шэсць гадоў, леднікі страцілі яшчэ 12 працэнтаў аб'ёму.

Вучоныя сцвярджаюць, што адступленне лёду непасрэдна звязана са змяненнем клімату па ўсім свеце. Раставанне лёду прыкметна паскараецца. Па плошчы леднікі Швейцарыі складаюць каля паловы ўсіх леднікоў у Еўрапейскіх Альпах.

КАРАНІ і КРОНЫ

Сумесны выпуск газеты «Звязда» і Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя

№ 5 (68)

Прырода пад кантролем

130 ПАКАЗЧЫКАЎ СТАНУ ВАДЫ

даследуюцца ў Беларусі для захавання воднай бяспекі

Масавы замор рыбы на рацэ Одра, з якім сутыкнуліся Польшча і Германія, ацэньваецца сусветнай супольнасцю як прыродная катастрофа, з прычынамі якой гатовая дапамагчы разабрацца ў тым ліку і Беларусь. У прыватнасці, спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра аналітычнага кантролю ў галіне аховы навакольнага асяроддзя (РЦАК), якія маюць велізарны вопыт пры адборы проб у выпадках масавай гібелі рыбы і могуць вызначыць больш за 130 паказчыкаў у паверхневых водах. Чым дакладна здольныя дапамагчы беларусы і што яны робяць для захавання бяспекі ў рэках уласнай краіны, высвятляла карэспандэнт «Звязды».

ГАДЗІНА НА ПРЫЕЗД, 15 ХВІЛІН — НА АНАЛІЗЫ

Беларускія эксперты гатовыя адгукнуцца на першы ж запыт пацярпелых краін, каб дапамагчы ў пераадоленні экалагічнага бедства, запэўніў **міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй ХУДЫК:**

— Мінпрыроды дзейнічае ў духу добрасуседства і пацвярджае, што ахова навакольнага асяроддзя — наш агульны клопат, які павінен ажыццяўляцца на падставе ўзаемнай падтрымкі і дапамогі. Мы гатовыя накіраваць сваіх спецыялістаў для адбору проб і аказання іншай неабходнай дапамогі ў сітуацыі, якая склалася.

РЦАК актыўна супрацоўнічае з лабараторнымі службамі Расіі і Літвы. Штогод гэтымі падраздзяленнямі праводзяцца міжлабараторныя зверкі, спецыялісты розных краін сумесна адбіраюць пробы вады на трансгранічных пунктах кантролю рэк Нёман, Заходняя Дзвіна, Дняпро, расказала **намеснік начальніка Рэспубліканскага цэнтра аналітычнага кантролю ў галіне аховы навакольнага асяроддзя Святлана КАСЦЯН:**

— У нашага цэнтра ёсць міжнародны атэстат акрэдытацыі. Для пацвярджэння кампетэнтнасці лабараторый цэнтру неабходна на працягу пяці гадоў праводзіць такія міжлабараторныя параўнанні і супастаўляць атрыманыя значэнні для ўдакладнення вынікаў кантролю.

Мае РЦАК і ўласную мабільную лабараторыю для работы на аварыях. У будні яе спецыялісты прыязджаюць на месца здарэння за гадзіну, у выхадныя ці нерабочы час — на працягу трох.

— Эксперты бяруць пробы і адразу на месцы правяраюць тэмпературу вады, узровень кіслароду ў ёй і кіслотна-шчолачны баланс (pH). Праз 15-20 хвілін выдаюцца звесткі і пра наяўнасць у водзе нітратаў, сульфатаў і фасфатаў, — расказала спецыяліст. — Забруджвальныя рэчывы, як правіла, нябачныя для вока, але ёсць і заўважныя: пеністыя СПАРы (сінтэтычныя паверхнева-актыўныя рэчывы — групы хімічных злучэнняў, наяўнасць якіх у сцёкавых водах пагражае санітарнаму стану вадаёмаў) і нафтапрадукты. Каб высветліць крыніцу небяспекі, што з'явілася ў вадзе і нябачная воку, трэба браць пробы вышэй па цячэнні на пэўнай адлегласці ад месца выяўлення забруджвання. Нафтапрадукты, разлітыя ў вадзе, абазначаюць загараджальнымі бонамі, якія спыняюць распаўсюджванне небяспечнай плямы па вадзе.

КІСЛАРОД, ЦЯЖКІЯ МЕТАЛЫ, ВАПНА

У цэнтры могуць рабіць аналізы больш як па 130 паказчыках у вадзе. Гэта адзіная ў краіне ўстанова, якая здольная выявіць у вадаёме хлорарганічныя пестыцыды, поліцыклічныя араматычныя вуглевадароды і полікларыраваны біфеніл. Бяруць пробы і на распаўсюджаныя цяжкія металы, у тым ліку ртуць; выяўляюць, ці ўтрымлівае вада нітраты, нітрыты, фасфаты.

— Спецыялісты нашай лабараторыі вызначаюць таксама паказчыкі хімічнага (ХСК) і біяхімічнага спажывання кіслароду (БСК), велічыні якіх адлюстроўваюць расход кіслароду, неабходны для раскладання забруджвальных арганічных злучэнняў. Масавы замор рыбы можа здарыцца, калі ў вадзе ніскі ўзровень O_2, — растлумачыла Святлана Касцян. — У вельмі гарачае надвор'е, напрыклад, кісларод актыўна спажываецца, і ў вадзе яго становіцца значна менш, таму ў ваду дадаюць вапну. У моцныя маразы водным насельнікам таксама можа не хапаць кіслароду, таму, каб павялічыць яго ўтрыманне, робяць лункі.

За кожным водным аб'ектам замацаваны пэўны суб'ект гаспадарання: водаканал, «Мінскзелянбуд» і іншыя. Вынікі даследаванняў спецыялісты цэнтра накіроўваюць у тэрытарыяльныя органы Мінпрыроды, дзе ўжо і вырашаюць, чым менавіта трэба дапамагчы пэўнаму аб'екту.

Алеся ПАШКО, вядучы інжынер-хімік РЦАК сочыць за працай газавага храматографа.

СЦЁКАВЫЯ ВОДЫ — ПРАМЫСЛОВЫЯ І ПАВЕРХНЕВЫЯ

Планавы кантроль стану вады на буйных водных аб'ектах, напрыклад, куды трапляюць сцёкавыя воды ад прадпрыемстваў, праводзіцца раз у адзін ці тры месяцы. Спецыялісты правяраюць пералік рэчываў, на скід якіх у прадпрыемства ёсць дазвол, а па выніках выпрабаванняў выдаюць пратакол, дзе ўказваецца, ці не перавышаны нарматывы для сцёкавых вод, якія трапляюць у вадаёмы, акрэсліла прадстаўніца цэнтра:

— На «Мінсводаканале», напрыклад, вада адбіраецца на даследаванні на выпуску з ачышчальных збудаванняў, вышэй па цячэнні ракі (да ачышчальных збудаванняў) і ніжэй за іх. Такім чынам высвятляецца, ці ўплывае скід на раку. Дакладная перыядычнасць кантролю вызначана ў ЭкаНіП — абавязковых для выканання тэхнічных нарматыўных прававых актаў у галіне аховы навакольнага асяроддзя, згодна з колькасцю скідваемых у пэўны вадаём сцёкавых вод. Найчасцей у такіх скідах сустракаюцца перавышэнні па БСК5 і нітратнай групе забруджвальнікаў.

Даследуюцца ў тым ліку паверхневыя сцёкавыя воды (ліўневая каналізацыя, у якую трапляюць дажджавыя ці снегавыя ападкі). Пробы ў іх таксама адбіраюцца ў трох месцах: на скідзе вады, вышэй за гэты аб'ект і ніжэй за яго.

— Таксама ў вадзе фіксуецца ўтрыманне металаў. Аднак гэта як з аналізам крыві ў чалавека — усё залежыць ад колькасці. У пэўным вадаёме — свае паказчыкі, і калі яны не мяняюцца на працягу дзесяцігоддзяў, нягледзячы на скіды прадпрыемстваў, значыць, яны склаліся натуральным шляхам, — дадала Святлана Касцян.

Свой састаў вады ўвогуле маюць рэкі і азёры ў кожным рэгіёне Беларусі, а калі браць у сярэднім, то стан водных аб'ектаў краіны ацэньваецца як «добры» і «вельмі добры». Паглядзець, якія «адзнакі» маюць аб'екты, можна на сайце https://rad.org.by/monitoring/aqua. Аднак ніхто не адмяняў антрапагеннага ўздзеяння на ваду ў межах горада, таму спецыялісты не раяць плаваць у рэках на тых участках, што прыпадаюць на цэнтры гарадоў.

Некаторыя аналізы спецыялісты цэнтра робяць адзіныя ў краіне. Сёлета вось акрэдытаваліся на дыяксіды і фураны. У РЦАК могуць даследаваць пробы не толькі вады, але і глебы, адходаў, выкідаў у атмасфернае паветра ад транспарту і прадпрыемстваў — усяго больш як па 400 паказчыках.

Ірына СІДАРОК, фота аўтара.

Грамадская ініцыятыва

УКЛЮЧАЙСЯ Ў «ЗЯЛЁНАЕ» ЖЫЦЦЁ!

Сёння ў нашай краіне ёсць шмат магчымасцяў для ўключэння неабыякавых грамадзян у экалагічны рух. Ва ўзаемадзеянні з грамадскімі арганізацыямі і дзяржаўнымі органамі яны могуць вырашыць шмат праблем у гэтай сферы.

Станьце грамадскім эколагам

Гэтыя прадстаўнікі грамадскасці і неабыякавыя людзі дапамагаюць тэрытарыяльным органам Мінпрыроды, бяруць удзел у кантрольна-аналітычных мерапрыемствах і акцыях, распаўсюджваюць экалагічную інфармацыю сярод розных груп насельніцтва, праводзяць сустрэчы і семінары, тэматычныя ўрокі.

Каб стаць грамадскім эколагам, неабходна звярнуцца ў інспекцыю ці камітэт прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя па месцы жыхарства.

• Паводле даных Мінпрыроды, у краіне сёння дзейнічае каля 500 грамадскіх інспектараў, штогод праводзіцца каля 30 пасяджэнняў грамадскіх каардынацыйных экалагічных саветаў, на якіх разглядаецца больш за сто значных пытанняў. Усё больш актыўна беларускія грамадзяне бяруць удзел у грамадскіх абмеркаваннях экалагічных рашэнняў, якія прымаюцца ў рэгіёнах.

Увайдзіце ў склад ГКЭС

Ужо больш за 20 гадоў пры цэнтральным апараце Мінпрыроды і яго камітэтах існуюць грамадскія каардынацыйныя экалагічныя саветы (ГКЭС), якія носяць экспертна-кансультацыйны характар. Падчас іх пасяджэнняў прадстаўнікі грамадскасці (туды ўваходзяць члены грамадскіх аб'яднанняў, навукі і адукацыі, СМІ і актыўныя грамадзяне) прымаюць удзел у абмеркаванні найбольш вострых экалагічных пытанняў, выносяць рэкамендацыі прыродаахоўным службам, разглядаюць праекты змен у заканадаўства і многае іншае. Праз дыялог дзяржава і грамадскасць імкнуцца выпрацаваць аптымальныя «зялёныя» рашэнні.

Каб увайсці ў склад саветаў, неабходна звярнуцца ў міністэрства і яго камітэты.

Бярыце ўдзел у грамадскіх абмеркаваннях

Грамадскія абмеркаванні прыняцця экалагічна значных рашэнняў — важная форма ўдзелу жыхароў краіны ў заканатворчай і прыродаахоўнай дзейнасці. З іх дапамогай можна прадухіліць магчымыя экалагічныя праблемы, выратаваць ад знішчэння каштоўныя прыродныя аб'екты, зрабіць малую радзіму больш камфортнай для пражывання.

Як расказалі ў Мінпрыроды, грамадскасць сёння абмяркоўвае і дапамагае рыхтаваць праекты законаў і пастаноў у галіне экалогіі; праграмныя дакументы, рэалізацыя якіх аказвае ўздзеянне на навакольнае асяроддзе і (ці) звязана з выкарыстаннем прыродных рэсурсаў; справаздачы аб ацэнцы ўздзеяння на навакольнае асяроддзе; дакументы па стратэгічнай экалагічнай ацэнцы.

Без удзелу грамадскасці не прымуцца рашэнні аб выдачы дазволаў на выдаленне аб'ектаў раслінтага свету ў населеных пунктах ці іх перасадцы.

— У нас назапашаны досыць вялікі досвед дыялогу з насельніцтвам, беларускія грамадзяне неабыякавыя да праблем экалогіі і актыўна супрацоўнічаюць з дзяржаўнымі службамі, — расказала **намеснік начальніка ўпраўлення аналітычнай работы, навукі і інфармацыі Мінпрыроды Алена МЕЛЯШКОВА.** — Удзел грамадзян у прыняцці рашэнняў, якія аказваюць уплыў на наваколле, і ўлік іх меркаванняў у гэтым пытанні можна разглядаць як дадатковы канал зваротнай сувязі. Гэта дазваляе выбудоўваць дыялог дзяржаўных органаў і грамадскасці, у тым ліку каб атрымаць грамадскую ці прафесійную ацэнку экалагічна значных рашэнняў, а таксама выказыць адпаведнасць такіх рашэнняў чаканням грамадскасці для магчымай наступнай іх карэкціроўкі. Высокая ступень адкрытасці працэсу прыняцця экалагічна значных рашэнняў па пытаннях навакольнага асяроддзя ў далейшым умацоўвае падтрымку такіх рашэнняў з боку грамадскасці.

Разам фарміраваць экалагічную свядомасць

Старшыня грамадскага аб'яднання «Экаманіторынг» Яўген ФІЛІМОНАЎ падзяліўся вопытам удзелу арганізацыі ў грамадскіх абмеркаваннях.

— «Экаманіторынг» афіцыйна працуе ў сферы экалогіі з 2017 года, а да гэтага — як грамадская ініцыятыва «Зялёны дазор». За час працы арганізацыі былі вырашаны сотні праблем, рэалізаваны дзясяткі кейсаў, праведзены шэраг адукацыйных мерапрыемстваў (праекты, семінары, трэнінгі, акцыі). Мы не на словах, а на справе паляпшаем экалагічнае становішча, арганізоўваем работу па добраўпарадкаванні Гродна, ствараем умовы для масавага адпачынку і павышэння турыстычнай прывабнасці Гродзенскай вобласці.

З 2017 года ГА «Экаманіторынг» уваходзіць у склад каардынацыйнага савета пры Гродзенскім абласным камітэце прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, з 2020 года — у склад ГКЭС пры Мінпрыроды. Арганізацыя мае багаты досвед па прыцягненні грамадскасці ў розныя праекты і экалагічныя акцыі.

Разам мы ратавалі ад высечкі каштоўнае дрэва ў горадзе (падчас акцыі «Шалік для дуба»). Другі цікавы кейс — удзел у грамадскіх абмеркаваннях «Будаўніцтва і абслугоўванне гідраэлектрастанцыі на рацэ Лоша Астравецкага раёна Гродзенскай вобласці».

Рэгулярна беручы ўдзел у грамадскіх абмеркаваннях, мы адстойваем пажаданні і інтарэсы гараджан, а самае галоўнае — разам фарміруем экалагічную іх свядомасць.

• У краіне каля 100 грамадскіх аб'яднанняў і экалагічных цэнтраў рэалізоўваюць свае ініцыятывы. Усё больш грамадзян з цікавасцю далучаюцца да акцый і кампаній па азеляненні, добраўпарадкаванні населеных пунктаў, прасоўваюць экалагічна дружалюбны лад жыцця, дапамагаюць жывёлам, якія трапілі ў бяду.

Наша аб'яднанне неаднаразова ўдзельнічала ў грамадскіх абмеркаваннях, а таксама праводзіла трэнінгі па павышэнні кампетэнцый і агульнай адукаванасці сярод грамадскасці. Улічаны, што экалагічныя пытанні вырашаюцца найбольш эфектыўна пры ўдзеле ўсіх зацікаўленых бакоў. Удзел грамадскасці робіць падстраваздачнымі тых, хто прымае рашэнні, а працэс іх прыняцця — больш празрыстым і якасным. Падчас дыялогу паміж дзяржаўнымі органамі, арганізацыямі і грамадскасцю прымаюцца больш узважаныя рашэнні з улікам розных меркаванняў і ідэй. Гэта таксама павялічвае сацыяльную адказнасць і згуртаванасць грамадзян. Такім чынам грамадскасць праз сваіх прадстаўнікоў бярэ ўдзел у рабоце дзяржаўных органаў.

Настасся АЛЯКСЕЕВА.
Фота з архіва ГА «Экаманіторынг».

Біяразнастайнасць

Для бяспекі людзей і дабрабыту жывёл

У краіне забаранілі ўтрымліваць у кватэрах некаторыя віды дзікіх жывёл, а таксама акрэслілі спіс магчымых «жыхароў» кантактных заапаркаў

1 жніўня ўвайшла ў сілу пастанова Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя ад 27.06.2022 № 34 з пералікам відаў дзікіх жывёл, забароненых да ўтрымання і (ці) развядзення ў няволі ў кватэрах шматкватэрных і блакіраваных жылых дамоў, аднакватэрных жылых дамах і на прыдамавых тэрыторыях, у садаводчых таварыствах, дачных кааператывах, а таксама пералік відаў дзікіх жывёл, якіх дазволена ўтрымліваць у кантактных заапарках.

Гэты дакумент — лагічны працяг дзейнасці прыродаахоўнага ведамства па ўдасканаленні заканадаўства, якое датычыцца дзікай фаўны. Так, у Законе «Аб жывёльным свеце», прынятым на пачатку года, былі закрануты праблемы ўтрымання дзікіх жывёл у хатніх умовах, у кантактных, а таксама ў перасоўных заапарках. Апошнія, дарэчы, былі забаронены ў нашай краіне — спецыялісты ўпэўнены, што такое існаванне жывёл у клетках з'яўляецца класічным варыянтам жорсткага абыходжання з імі.

Што датычыцца першых двух пытанняў, то вучоныя НАН Беларусі распрацавалі спецыяльныя дакументы. Першы ствараўся па такіх крытэрыях, як інвазійнасць (ступень пагрозы для біяразнастайнасці), небяспека для чалавека (таму ў спіс увайшлі вышэйшыя драпежнікі, ядавітыя жывёлы), немагчымасць утрымліваць гадаванцаў у хатніх умовах (бо для кожнага віду існуюць свае нормы камфортнага ўтрымання ў няволі).

ЧАМУ ТАКІЯ СПІСЫ З'ЯВІЛІСЯ НА СВЕТ?

Як расказала **кансультант упраўлення біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Мінпрыроды Таццяна ЖАЛЯЗНОВА**, некалькі гадоў таму стала актуальнай праблема ўтрымання ў хатніх умовах небяспечных жывёл. Шырокі рэзананс атрымала гісторыя з маладзенькай ільвіцай, якую грамадзянка нашай краіны трымала ў аднапакаёвай кватэры і прапаноўвала для фотасесій. Склалася вельмі небяспечная сітуацыя як для самой гаспадыні львіцы і яе суседзяў, так для жывёлы, для якой немагчыма было стварыць спрыяльныя ўмовы. Падобныя сітуацыі ў тым ліку сталі падставай для прапрацоўкі змен у заканадаўстве.

Згодна з пастановай, цяпер забаронена трымаць і разводзіць у хатніх умовах такіх жывёл, як каралеўская кобра, асобіны пітонаў, даўжыня якіх перавышае чатыры метры, усе віды марскіх чарапах,

Фота Анатоля КЛЕЩЧУКА.

Чырванавухія чарапахі — небяспечны інвазійны від.

прадстаўнікоў сямейства мядзведжых, ільвоў, тыграў, пум, рысяў, усе віды роду шымпанзэ і іншых родаў прыматаў, усе віды роду жураўліныя, кракадзілаў, гарнастаяў, тхароў (пры пэўных умовах), усходне-афрыканскую меданосную пчалу і іншых.

У КАНТАКЦЕ СА ЗВЯРКОМ

Яшчэ адзін спіс датычыцца відаў, якія можна ўтрымліваць у кантактных заапарках. Паводле слоў Таццяны Жалязновай, калі раней там можна было сустрэць у асноўным сельскагаспадарчых і хатніх жывёл, то цяпер туды засяляюць шмат экзотыкі. Для такіх відаў сустрэча з чалавекам — заўсёды стрэс, і іх рэакцыі на такія зносіны могуць быць непрадказальнымі.

— Падчас працэдуры рэгістрацыі ў адным з такіх кантактных заапаркаў спецыялісты выявілі сундайскага лору, які выдзяляе таксіны пры судакрананні, — расказала прадстаўнік Мінпрыроды. — Таму перш чым купляць якую-небудзь экзатычную жывёлу, вывучыце яе біялогію, каб не дапусціць падобных выпадкаў.

У кантактных заапарках дазволілі ўтрымліваць прадстаўнікоў такіх відаў, як качка-крыжанка, нутрыя, зебравая амадзіна, марская свінка, дэгу, віды сямейства вавёркавых, мадагаскарскі таракан і іншых.

Інга ЗУБРЫЦКАЯ.

✓ Калі вы хочаце купіць прадстаўніка дзікай фаўны, звярніцеся ў Мінпрыроды ці Нацыянальную акадэмію навук, — там падкажуць, якія складанасці могуць быць з утрыманнем канкрэтнага віду.

✓ Калі вы купілі экзатычную жывёлу да 1 жніўня ці паспелі яе зарэгістраваць, для вас дзейнічае пераходнае становішча — гадаванец застанецца з вамі да наступлення яго натуральнай смерці, але новых купляць забаронена.

✓ Артыкулам 16.23 КаАП «Парушэнне патрабаванняў заканадаўства аб ахове і выкарыстанні жывёльнага свету» прадугледжаны штраф да 30 базавых велічынь. Сёння таксама прапрацоўваецца пытанне, каб увесці канфіскацыю жывёл пры падобных правапарушэннях.

Навядзенне парадку

ВОДНЫЯ КАМБАЙНЫ І РЫБЫ

дапамагаюць змагацца з водарасцямі ў рэках і азёрах

Расліннасць у рэках і азёрах служыць кормам для рыб, аднак празмернае зарастанне пагражае памяншэннем кіслароду ў вадзе з-за гніення раслін, што ў сваю чаргу можа прывесці да замору насельнікаў вадаёмаў. Каб пазбегнуць гэтага і захаваць прывабны выгляд прыроднай вады, водарасці косяць спецыяльнымі камбайнамі і косамі, вадаёмы зарыбліваюць, а на ваду ўздзейнічаюць ультрафіялетам. Як гэта робіцца, расказала Вікторыя ВОРАНАВА, начальнік аддзела выкарыстання і аховы водных рэсурсаў Мінпрыроды.

Што празмерна — тое нездарова

Прараджваюць водныя расліны ўздоўж берагавой лініі кожныя 10—15 гадоў, а вось «стрыгуць» водарасці некалькі разоў у сезон, прынамсі ў сталіцы (Камсамольскае возера, рака Свіслач ды Сляпянская водная сістэма). У Мінску гэта цяпер робяць спецыяльнымі воднымі камбайнамі. Хоць да гэтага выкарыстоўвалі маторныя лодкі з грэбенямі-граблямі, на якія водарасці проста накручваліся. А яшчэ раней — на «воднай сенажаці» працавалі ўвогуле ўручную з касой. Апошнія два спосабы дагэтуль прымяняюцца ў рэгіёнах краіны.

Пакос узбярэжнай і воднай расліннасці ўваходзіць у пералік відаў работ па ўтрыманні паверхневых водных аб'ектаў у належным стане і іх добраўпарадкаванні, патлумачыла неабходнасць касьбы спецыяліст Мінпрыроды. Аднак ёсць віды раслін, якія дапускаюцца для пасадкі на вадаёмах з мэтай іх добраўпарадкавання. У прыватнасці, чарот лясны і клубнечарот марскі.

— Прыбярэжная і водная расліннасць у водных аб'ектах, безумоўна, служыць ежай для шматлікіх біялагічных рэсурсаў, а таксама з'яўляецца асяроддзем іх пражывання. Аднак празмерная колькасць раслін прыводзіць да зарастання вадаёмаў, а гніенне водарасцяў пагаршае стан вады па біягенных паказчыках (азотная і фосфарная групы) і зніжае колькасць кіслароду ў вадзе. Гэта шкодзіць рэкам і азёрам, вядзе да іх абмялення і нават масавай гібелі рыбы.

Даследаваць, касіць, захоўваць...

Згодна з заканадаўствам (артыкул 27-1 Воднага кодэкса, які ўвайшоў у сілу сёлета з красавіка), утрыманне водных аб'ектаў у належным стане павінны забяспечваць мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы на землях агульнага карыстання і землях запасу. А таксама юрыдычныя асобы і грамадзяне, у тым ліку індывідуальныя прадпрымальнікі, якія карыстаюцца паверхневымі воднымі аб'ектамі па праве адасобленага і (ці) спецыяльнага водакарыстання або арэнды ці ў якіх гэтыя аб'екты змешчаны ў межах іх зямельных участкаў, падкрэсліла Вікторыя Воранава:

— Абазначаныя водакарыстальнікі павінны прымаць меры для распрацоўкі комплексу мерапрыемстваў, скіраваных на ўтрыманне паверхневых водных аб'ектаў у належным стане. Робіцца гэта сумесна са спецыялізаванымі арганізацыямі, якія даследуюць паверхневыя воды, вызначаючы відавую разнастайнасць рыб і месцаў іх размнажэння, нагулу, зімоўкі, міграцыі. Спецыялісты таксама выяўляюць прычыны пагаршэння экалагічнага стану (статусу) паверхневых вод і замераў рыбы, і даюць рэкамендацыі для паляпшэння сітуацыі.

Памяншаюць празмерны рост раслін, аднак недапушчальна выдаляць усю водную зеляніну, апроч інвазійных відаў. Акрамя таго, падчас касьбы трэба захоўваць рэдкія віды раслін і не дапускаць іх пашкоджання. Для выдалення ўзбярэжнай і воднай расліннасці неабходна выкарыстоўваць інструменты, якія выключаюць пападанне гаруча-змазачных матэрыялаў у паверхневыя воды, абазначыла прадстаўніца міністэрства:

— Акрамя механічнага спосабу (касьбы), дзейсны сродак ачысткі водных аб'ектаў ад празмернай расліннасці — іх зарыбленне. А для прадухілення інтэнсіўнага росту водных раслін, асвятлення вады і знішчэння яе «цвіцення» на ваду можна ўздзейнічаць ультрафіялетам. Гэта знішчае ў вадзе патагенныя мікробы і вірусы.

Спецыялісты сцвярджаюць, што калі не чысціць рэкі, то працэс эўтрафікацыі — насычэння водных раслін — паступова можа ператварыць іх у сапраўдныя балоты. Невялікім вадаёмам на гэта хопіць літаральна некалькі гадоў. Каб дапамагчы рэкам, азёрам ды рыбам, а заадно і самому сабе (бо некаторыя віды водарасцяў таксічныя ў тым ліку і для чалавека), варта выкарыстоўваць у побыце мыйныя сродкі без фасфатаў, якімі любяць харчавацца водарасці. А таксама дбайна сачыць за якасцю ачысткі камунальна-бытавых і сельскагаспадарчых сцёкавых вод, каб у іх было як мага меней гэтых самых фасфатаў.

Ірына СІДАРОК, фота аўтара.

БАРАЦЬБА ЗА АБІТУРЫЕНТА

СТАЎКА — НА ПРОФІЛЬНЫЯ КЛАСЫ

— Для нас прафарыентацыя — працэс бесперапынны, — падкрэслівае **прарэктар па вучэбнай рабоце Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Еўфрасінні Полацкай Юрый ГОЛУБЕЎ.** — Мы прыкладаем шмат намаганняў для прыцягнення ў свой універсітэт выпускнікоў са свайго рэгіёна, каб пасля вучобы, стаўшы спецыялістамі, яны заставаліся працаваць у Полацку і Наваполацку — гэта буйныя прамысловыя цэнтры з развітой сацыяльнай інфраструктурай. Дзеля гэтага масава адкрываем у школах, гімназіях і ліцэях профільныя класы, пераважна тэхніка-тэхналагічнага профілю, паколькі наш рэгіён — прамысловы і ёсць вялікая патрэба ў адпаведных кадрах. Да таго ж у структуры спецыяльнасцяў Полацкага ўніверсітэта вялікую долю складаюць спецыяльнасці менавіта тэхніка-тэхналагічныя. Пераважна мы працуем на свой рэгіён, і абітурыентаў з Віцебскай вобласці ў нас прыкладна 80 працэнтаў ад агульнай колькасці. Каля 10 працэнтаў абітурыентаў — з Мінскай вобласці, астатнія — з розных рэгіёнаў нашай краіны.

У 2022 годзе прыём у Полацкім дзяржаўным універсітэце праводзіўся па 36 спецыяльнасцях (гэта на чатыры больш, чым летась) Так, сёлета на факультэце інфармацыйных тэхналогій адкрылася новая спецыяльнасць «Штучны інтэлект (інструментальныя сродкі і тэхналогія праектавання інтэлектуальных сістэм)». Таксама аднавілі набор па спецыяльнасцях, якія, магчыма, не карыстаюцца ў абітурыентаў вялікім попытам, але такія спецыялісты вельмі патрэбныя рынку працы. Мы пайшлі насустрач працадаўцам — перш за ўсё працуем з заяўкамі, якія паступаюць ва ўніверсітэт ад іх. Бюджэтныя месцы ў Полацкім дзяржаўным універсітэце ўсе былі запоўненыя, а па платным наборы ў нас невялікі недабор.

Традыцыйна ва ўніверсітэце самыя высокія прахадныя балы фіксуюцца на спецыяльнасцях гуманітарнага профілю, але сёлета і на тэхнічных спецыяльнасцях яны былі даволі высокія. Нас радуе, што матываваныя абітурыенты з прыстойнымі баламі выбіралі спецыяльнасці, востра патрэбныя нашаму рэгіёну, як, напрыклад, «Хімічная тэхналогія прыродных энераносьбітаў і вуглародных матэрыялаў». А ўвогуле конкурс па ўніверсітэце на бюджэтную форму навучання склаў 1,5 чалавека на месца.

У ЧАРЗЕ ПА ПЕДАГОГАЎ

— У нас сёлета былі закрыты ўсе кантрольныя лічбы прыёму, — канстатуе **намеснік адказнага сакратара прыёмнай камісіі Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна Надзея НІКІЦІНА.** — Найбольш высокія прахадныя балы на дзённай бюджэтнай форме навучання зафіксаваныя на спецыяльнасцях «Руская філалогія (літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць)» — 323 і «Сучасныя замежныя мовы (англійская, нямецкая)» — 320 балаў.

Нядрэнная сітуацыя склалася на дзвюх новых спецыяльнасцях, якія адкрыліся сёлета. Мы ажыццяўлялі толькі першы набор. Так, на спецыяльнасці «Інфармацыя і камунікацыя» конкурс склаў 2,7 чалавека на месца, а прахадны бал — 304. На спецыяльнасці «Урбаналогія і сіці- менеджмент» — конкурс 1,6 чалавека на месца, а прахадны бал — 245. На платную форму навучання на гэтыя месцы таксама быў дастаткова высокі конкурс. Спецыяльнасць «Урбаналогія і сіці-менеджмент» — увогуле наватарская. Яна летась упершыню была ўнесена ў класіфікатар спецыяльнасцяў Рэспублікі Беларусь і мае на ўвазе атрыманне ведаў па трансфармацыі гарадскіх сістэм, падрыхтоўку спецыялістаў для так званых «разумных» гарадоў і «зялёнай» эканомікі.

Вынікамі прафарыентацыйнай работы, якая праводзіцца круглы год і ўключае сотні мерапрыемстваў (і традыцыйныя, і нетрадыцыйныя), цалкам задаволеныя і ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка.

— У нас не было спецыяльнасцяў, на якія праводзіўся б дадатковы набор, — падкрэслівае **прарэктар па вучэбнай рабоце Сяргей ВАСІЛЕЦ.** — А на чатыры спецыяльнасці прахадныя балы ўвогуле не ўстанаўліваліся, таму што ўсе бюджэтныя месцы былі запоўнены абітурыентамі, якія мелі права на льготы і паступалі без здачы экзаменаў: гэта «Руская мова і літаратура», «Руская мова і літаратура. Замежная мова», «Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны» і «Аздараўленчая і адаптыўная фізічная культура».

Кожны пяты першакурснік бюджэтнай формы навучання — медаліст або ўладальнік дыплома з адзнакай. У БДПУ таксама паступілі 172 выпускнікі профільных педагагічных класаў. Хтосьці з іх паступаў па сумоўі, а хтосьці вырашыў паступаць па выніках ЦТ. Хочацца таксама адзначыць высокі ўзровень узаемадзеяння заказчыкаў кадраў з абітурыентамі. Так, на месцы, выдзеленыя пад мэтавую падрыхтоўку, паступалі абітурыенты, якія мелі больш як 300 балаў і маглі б прайсці і па звычайным конкурсе, але выбралі іншую траекторыю, бо плануюць пасля навучання вярнуцца ў свой рэгіён. Гэта таксама вынікі якасна праведзенай прафарыентацыйнай работы. І заказчыкі кадраў сталі больш старанна адбіраць кандыдатаў на мэтавую падрыхтоўку. У БДПУ на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі былі залічаны 210 абітурыентаў. Гэта амаль чвэрць ад агульнай колькасці першакурснікаў дзённай формы атрымання адукацыі.

Фота hspu.by

Сяргей Васілец адзначыў, што на кожнага выпускніка БДПУ паступае ў сярэднім 3-4 заяўкі. «Ужо цяпер перад пачаткам навучальнага года шмат зваротаў з боку ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі, якія загадзя хочуць убачыць, хто да іх прыйдзе на работу. Гэта можа быць і просьба аб накіраванні ім студэнта на практыку, і просьба аб афармленні яго на работу па сумяшчальніцтве. Мы ідзём насустрач, але ў нас ёсць жорсткія патрабаванні: гэта павінны быць студэнты старшых курсаў, якія добра паспяваюць па вучобе», — падкрэсліў Сяргей Васілец.

ЯШЧЭ АДЗІН ШАНЦ

— Вакантных месцаў на бюджэтнай форме навучання ў ВНУ сёлета засталося няшмат — каля 400, — запэўнівае **начальнік галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі Міністэрства адукацыі Сяргей КАСПЯРОВІЧ.** — І пасля працэдуры дадатковага набору большая іх частка была запоўнена: засталося каля 80 месцаў у дзвюх установах вышэйшай адукацыі — у Беларускім дзяржаўным універсітэце харчовых і хімічных тэхналогій і ў Горацкай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі. Дадатковы набор на вакантныя месцы ў ВНУ — гэта адзін з этапаў тэхналогіі прыёму на бюджэт. Такое паняцце, як дадатковы набор, ёсць толькі ў вышэйшай школе і толькі ў дачыненні да бюджэтнай формы навучання. Ён існуе для таго, каб вакантныя месцы, што засталіся пасля асноўнага набору (а гэта нармальная з'ява ў адносінах да спецыяльнасцяў, якія ў меншай ступені запатрабаваныя абітурыентамі, але моцна запатрабаваныя эканомікай), былі запоўнены. Бо часта, кіруючыся амбіцыямі, абітурыент робіць свой выбар на карысць нейкай больш прэстыжнай, на погляд моладзі, спецыяльнасці. Потым высвятляецца, што яму не хапае балаў, але ён да апошняга трымаецца за гэту спецыяльнасць, спадзяецца, што ў кагосьці не вытрымаюць нервы і ён забярэ дакументы, а гэтага не адбываецца. І абітурыент застаецца за бортам. А дадатковы набор дазваляе абраць з ліку спецыяльнасцяў, дзе засталіся незапоўненыя месцы, блізкія абітурыенту, і паступіць на бюджэтную форму навучання. Сёлета мы назіралі выпадкі, калі падчас дадатковага набору на асобныя спецыяльнасці конкурс, прахадны бал і якасны склад абітурыентаў былі нават вышэйшыя, чым падчас асноўнага набору. У цэлым можна канстатаваць, што дадатковы набор прайшоў паспяхова і была забяспечана магчымасць для абітурыентаў паступіць на бюджэт, — адзначыў Сяргей Каспяровіч.

ТРЫ ЦТ + ЦЭНТРАЛІЗАВАНЫ ЭКЗАМЕН

Налета ў ВНУ з'явіцца новы магутны інструмент прыцягнення абітурыентаў — універсітэцкія алімпіяды.

— У першую чаргу, яны будуць праводзіцца рэгіянальнымі ВНУ, каб абітурыенты з гэтых рэгіёнаў заставаліся на малой радзіме. Пераможцы такіх спаборніцтваў змогуць стаць студэнтамі ВНУ яшчэ да пачатку ўступнай кампаніі, — паведаміла **начальнік упраўлення вышэйшай адукацыі Міністэрства адукацыі Алена ЛІПА.** — Для розных спецыяльнасцяў будуць вызначаны свае квоты на прыём абітурыентаў па выніках алімпіяды. На запатрабаваныя эканомікай спецыяльнасці месцаў пад перамог-цаў алімпіяд будзе выдзяляцца, вядома, больш.

З наступнага года выпускнікі ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі будуць здаваць выніковыя іспыты па адной з дзяржаўных моў і матэматыцы ў форме цэнтралізаванага экзамену. Гэта адначасова выпускны экзамен за курс школы і ўступны іспыт у ВНУ. Яго вынікі адаб'юцца на адзнацы, што пойдзе ў атэстат аб агульнай сярэдняй адукацыі. Паступленне ў ВНУ будзе ажыццяўляцца на падставе сертыфікатаў цэнтралізаванага экзамену, вынікаў цэнтралізаванага тэсціравання (па профільных прадметах), а таксама сярэдняга бала дакумента аб адукацыі.

З 2023 года ў абітурыентаў будзе магчымасць здаць да трох ЦТ па любых прадметах, якія не здаюцца на цэнтралізаваным экзамене: па фізіцы, хіміі, гісторыі, замежнай мове і гэтак далей. У выніку пры паступленні ў абітурыента на руках можа аказацца да пяці сертыфікатаў: тры сертыфікаты ЦТ плюс два сертыфікаты цэнтралізаванага экзамену. Гэта забяспечыць маладым людзям шырокі выбар спецыяльнасцяў.

З наступнага года ў Правілах прыёму ў вышэйшыя навучальныя ўстановы прадугледжана павелічэнне гранічных квот у рамках мэтавай падрыхтоўкі: на сельскагаспадарчых спецыяльнасцях — да 70 працэнтаў ад кантрольных лічбаў прыёму, па медыцынскіх — да 80 працэнтаў і па іншых спецыяльнасцях — да 60 працэнтаў. Гэта не значыць, што будуць менавіта такія лічбы мэтавага набору, усё залежыць ад таго, ці знойдзецца столькі заказчыкаў, гатовых падлічыць свае патрэбы ў кадрах на 4-5 і больш гадоў наперад.

Але адметнасцю сёлетняй прыёмнай кампаніі ў БДМУ стала пашырэнне мэтавага набору да 50 працэнтаў ад колькасці бюджэтных месцаў. Да таго ж упершыню быў зроблены набор студэнтаў-«мэтавікаў» для Мінска, якія пасля завяршэння навучання будуць размеркаваны на першыя рабочыя месцы ў сталіцу...

Надзея НІКАЛАЕВА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Класныя навіны

Першы урок — урок гістарычнай памяці

Дзяржаўныя сімвалы і выкананне гімна будуць абавязковымі атрыбутамі ўсіх урачыстых мерапрыемстваў 1 верасня. «У гістарычнай памяці сіла і адзінства беларускага народа» — менавіта так сфармуляваная тэма першага ўрока ва ўсіх беларускіх школах.

Міністэрства адукацыі падрыхтавала рэкамендацыі па арганізацыі сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі ў 2022/2023 навучальным годзе.

Асаблівая ўвага будзе ўдзяляцца ідэалагічнаму, грамадзянскаму і патрыятычнаму выхаванню навучэнскай моладзі, выхаванню ў яе інфармацыйнай культуры, азнаямленню з матэрыяламі па тэматыцы генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, а таксама выхаванню культуры бяспекі жыццядзейнасці і здаровага ладу жыцця.

На працягу навучальнага года будзе прадоўжана практыка правядзення адзіных урокаў, прысвечаных памятным падзеям, дзяржаўным святам і знамянальным датам у гісторыі Рэспублікі Беларусь. У 2022/2023 навучальным годзе працягнецца рэалізацыя інфармацыйна-адукацыйнага праекта «Школа Актыўнага Грамадзяніна», накіраванага на фарміраванне грамадзянскай кампетэнтнасці навучэнцаў.

У наступным навучальным годзе ва ўсіх школах будуць стварацца музеі і музейныя пакоі, а таксама тэматычныя экспазіцыі, у тым ліку прысвечаныя Году гістарычнай памяці і генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Не застануцца без увагі і такія важныя напрамкі, як фарміраванне інфармацыйнай культуры навучэнцаў, развіццё навыкаў бяспечных і адказных паводзін у інтэрнэце, прафілактыка і папярэджанне правапарушэнняў у галіне інфармацыйнай прасторы.

У 2022/2023 навучальным годзе працягнецца работа па ўключэнні навучэнскай моладзі ў дабрачынную дзейнасць і валанцёрскі рух. Будуць арганізаваны дабрачынныя акцыі па аказанні дапамогі інвалідам, ветэранам вайны і працы, непаўналетнім вязням.

Будзь у курсе!

Як атрымаць вызваленне ад урокаў працы?

Міністэрства аховы здароўя склала спіс захворванняў, наяўнасць якіх дае школьнікам магчымасць атрымаць вызваленне ад урокаў працы, а таксама ад заняткаў па дапрызыўнай і медыцынскай падрыхтоўцы. Адпаведная пастанова ведамства № 76 ад 26 ліпеня 2022 года апублікаваная на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале.

У прыватнасці, школьнікі змогуць атрымаць вызваленне ад вышэйзгаданых урокаў, калі ў іх быў дыягнаставаны саркаідоз. Таксама наведванне гэтых заняткаў можа стаць неабавязковым для дзяцей, у якіх выявілі расстройству псіхікі і паводзін, захворванні нервовай сістэмы, мігрэнь з аўрай і эпілепсію.

Акрамя таго, вызваленне ад урокаў працы, а таксама ад заняткаў па дапрызыўнай і медыцынскай падрыхтоўцы змогуць атрымаць школьнікі, у якіх ёсць захворванні вачэй і іх прыдатнага апарата, парушэнні вестыбулярнай функцыі.

Школьнікі таксама могуць быць вызвалены ад некаторых відаў работ на ўроках у тым выпадку, калі ў іх дыягнаставаны ларынгіт, рыніт, хранічныя захворванні дыхальных шляхоў. Акрамя ўсяго іншага, у спіс унесены псарыяз, эрытэма, крапіўніца і дэрматыты.

Пастанова ўступае ў дзеянне з 1 верасня 2022 года.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
24 жніўня 2022 г. № 32 (668)
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

АДГУКНУЦЦА НА ЧУЖУЮ БЯДУ

ЗАЎСЁДЫ знаходзіцца на сувязі з народам — адзін з прынцыпаў работы сенатарскага і дэпутацкага карпусоў нашай краіны. Прамыя лініі, прыёмы грамадзян, сустрэчы з працоўнымі калектывамі сталі рэгулярнымі мерапрыемствамі ў рабочым графіку прадстаўнікоў улады. І самае галоўнае, яны даюць плён. Адрамантаваныя дарогі, рэканструяваныя будынкі, пушчаныя па маршруце аўтобусы — гэтыя і іншыя вырашаныя пытанні, у тым ліку асабістага характару, сведчаць аб эфектыўнасці зваротнай сувязі.

Фота mosty-zara.by

Днямі, напрыклад, **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, старшыня агульнага сходу ўдзельнікаў СТАА «Контэ Спа» Валянцін БАЙКО** падарыў інвалідную каляску з электрапрыводам мастаўчаніну Віктару Філіпчыку. Гэтаму папярэднічала прамая тэлефонная лінія сенатара, на якую звярнуўся мясцовы жыхар: Віктар Філіпчык папрасіў аказаць дапамогу ў набыцці інваліднай каляскі з электрапрыводам. Для мужчыны, які дагэтуль перасоўваўся па горадзе пры дапамозе механічнай каляскі, гэта было выключэвай неабходнасцю. Сенатар на просьбу адгукнуўся. Па яго словах, працягнуць руку дапамогі і аказаць чалавечую падтрымку для яго вельмі важна.

Вычарпальныя тлумачэнні на звароты грамадзян, а адпаведна, і канкрэтныя даручэнні, былі дадзены падчас прамой тэлефоннай лініі **старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаіла РУСАГА.** Садзейнічанне сенатара патрабуецца ў вырашэнні праблем, звязаных з зямельнымі адносінамі, паляпшэннем жыллёвых умоў, навядзеннем парадку на могілках, удасканаленнем заканадаўства, добраўпарадкаваннем жылых дамоў і мясцовых дарог.

Пытанні, якія датычацца заканатворчай дзейнасці, зямельных праваадносін і абскарджання судовых пастаноў, закраналіся таксама падчас асабістага прыёму грамадзян **старшынёй Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргеем СІЎЦОМ.** Да члена гэтай камісіі, начальніка Магілёўскага інстытута МУС Валерыя Палішчука па прамой тэлефоннай лініі ў Дрыбіне звярнуўся жыхар Мсціслаўскага раёна з нагоды прыёму на службу ў органы ўнутраных спраў яго ўнука, які ў сёлетнім маі дэмабілізаваўся з арміі.

Спадчынныя, зямельныя і працоўныя праваадносіны цікавілі грамадзян на выязным прыёме ў Кобрыне члена Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, а па сумяшчальніцтве старшыні Брэсцкай абласной калегіі адвакатаў Тамары Шатлікавай. Падрыхтоўку школ да новага навучальнага года, навацыі Кодэкса аб зямлі, работу мясцовых органаў улады абмеркавала на сустрэчы з жыхарамі Навагрудскага раёна сенатар і дырэктар Навагрудскага дзяржаўнага сельскагаспадарчага прафесійнага ліцэя Эльвіра Сарока. Парламентарый і загадчыца натарыяльнай канторы горада Пінска Ірына Сачкоўская тлумачыла сваім землякам нормы давання, афармлення правоў на зямельныя ўчасткі і садовыя домікі. Да сенатара таксама звярнуліся грамадзяне Украіны — жанчына і яе непаўналетняя дачка. Дзяўчына жадае паступіць у беларускую прафесійную навучальную ўстанову, але не мае на руках дакумента аб атрыманні сярэдняй адукацыі.

Вераніка КАНЮТА.

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

Работа ў рэгіёнах

На мінулым тыдні беларускія сенатары актыўна працавалі ў рэгіёнах: праводзілі прамыя тэлефонныя лініі, прыёмы грамадзян, сустракаліся з калектывамі, а таксама бралі ўдзел у рэгіянальных святах.

Так, член Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, начальнік Магілёўскага інстытута МУС Валерый ПАЛІШЧУК наведаў X рэгіянальны фестываль народнай творчасці, народных промыслаў і рамёстваў «Дрыбінскія таржкі». «Мяне ўразіў дадзены фестываль, на якім я прысутнічаю ўпершыню, — падзяліўся ён. — Усё арганізавана на высокім узроўні — ад прадстаўлення гісторыі Дрыбінскага раёна да дэманстрацыі мясцовых вырабаў і паслуг».

У той жа дзень члены Савета Рэспублікі, дырэктар Гродзенскага абласнога драматычнага тэатра Ігар ГЕДЗІЧ і дырэктар Навагрудскага дзяржаўнага сельскагаспадарчага ліцэя Эльвіра Сарока ўдзельнічалі ў каравай-фестывалі «Бацькава булка», які ўпершыню прайшоў у горадзе Свіслач.

• У рамках адзінага дня інфармавання сенатар і старшыня РГА «Белая Русь» Алег РАМАНАЎ сустрэўся з працоўнымі калектывамі РУП «Фармацыя» і РУП «Гроднаэнерга» ў Гродне. Парламентарый акцэнтаваў увагу прысутных на важнасці інфармацыйнай і выхаваўчай работы ў працоўных калектывах. Старшыні пярвічных арганізацый РГА «Белая Русь» РУП «Фармацыя» і РУП «Гроднаэнерга» адзначылі шчыльнае супрацоўніцтва з кіраўніцтвам прадпрыемстваў і сумеснае фарміраванне кадравага патэнцыялу ў мэтах развіцця перспектыўнага працоўнага калектыву для дынамічнага развіцця аб'ектаў.

• У Брэсце з працоўным калектывам ТДА «Панда» сустрэлася член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, старшыня Брэсцкай абласной калегіі адвакатаў Тамара ШАТЛІКАВА разам з дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Яўгенам ЗАЙЦАВЫМ. Парламентарыі абмеркавалі пытанні, звязаныя з бягучай дзейнасцю прадпрыемства, развіццём сацыяльнай сферы, заканадаўствам.

• Добраўпарадкаванню Пінска было прысвечана пасяджэнне чарговай сесіі Пінскага гарадскога Савета дэпутатаў, у якім узяла ўдзел сенатар Ірына САЧКОЎСКАЯ. Парламентарый азнаёмілася з перспектывамі развіцця новага мікрараёна «Жамчужны» непасрэдна на будаўнічай пляцоўцы і ў зоне адпачынку пінчан. Разам з дэпутатамі яна наведала таксама рэабілітацыйны цэнтр для дзяцей-інвалідаў

• Член Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, дырэктар Навагрудскага дзяржаўнага сельскагаспадарчага прафесійнага ліцэя Эльвіра САРОКА ўзяла ўдзел у рабоце секцыі абласной інструктыўна-метадычнай нарады кіраўнікоў устаноў прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. На канферэнцыі былі вызначаны перспектывы развіцця рэгіянальнай сістэмы прафесійнай адукацыі, патрабаванні да яе якасці і зместу на сучасным этапе. Удзельнікі падзяліліся вопытам работы па рэалізацыі праграм прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

• Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі верхняй палаты парламента па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, дырэктар сярэдняй школы № 14 горада Маладзечна Каліна КАПУЦКАЯ ўзяла ўдзел у дыялогавай пляцоўцы «Чалавечы капітал як крытэрый культуры кіравання адукацыяй», якая адбылася ў рамках падрыхтоўкі канферэнцыі педагагічных работнікаў Мінскай вобласці. У сваім выступленні парламентарый адзначыла неабходнасць захавання гістарычнай памяці ў фарміраванні поглядаў і светаўспрыманні моладзі.

• Сенатар, дырэктар дзяржаўнага прадпрыемства «Саўгас-камбінат «Зара» Алег СЛІНЬКО ўзяў удзел у дабрачыннай акцыі «Дэпутаты — дзецям», якая была арганізавана для дзяцей са шматдзетных сем'яў — будучых першакласнікаў Мазыра і Мазырскага раёна. Па традыцыі дзецям былі ўручаны ўкамплектаваныя школьныя партфелі.

Валерыя СЦЯЦКО,
Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

МЕДЫЯПАРАДЫ АД СЕНАТАРА

Аўтарскія экспазіцыі аб родным краі ў сельскіх Дамах культуры, абменныя экскурсіі для жыхароў аграгарадкоў, удзел у прыёмах грамадзян у сельсаветах... Гэтыя і іншыя ідэі грамадзянскай актыўнасці моладзі абмеркавалі ўдзельнікі сустрэчы са старшынёй Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктарам ЛІСКОВІЧАМ у Гомельскім раёне.

Для парламентарыя падрыхтавалі насычаную праграму візіту. Пачаўся ён з матывацыйнай сустрэчы, як самі маладыя людзі назвалі некалькі гадзін жывых стасункаў з сенатарам. Задавалі хвалюючыя пытанні сенатару, дзяліліся ідэямі і напрацоўкамі актывісты маладзёжных Саветаў Гомельскага раённага Савета дэпутатаў і Гомельскага раённага аб'яднання прафсаюзаў.

Маладым актывістам было цікава пачуць ад Віктара Лісковіча пра яго асабісты досвед выкарыстання сучасных інфармацыйных рэсурсаў для дэманстрацыі грамадзянскай пазіцыі і «трансляцыі» той работы, якую праводзіць сам парламентарый і яго калегі. Сенатар падзяліўся, што самастойна, без памочнікаў, вядзе свае старонкі ў сацсетках.

— Заўсёды гатовы пазіцыянаваць каштоўнасць дзяржавы, у прыватнасці, і праз сваё жыццё, і праз работу. Для мяне важна паказаць, наколькі насычанае жыццё з пункту гледжання службовай дзейнасці ў кожнага, хто ёю займаецца. І ў той жа час хачу паказаць, што мы такія самыя простыя людзі, як усе. Мы можам і адпачываць, і атрымліваць задавальненне ад жыцця, заўважаем прыгажосць навакольнага свету, любуемся прыродай... У нас у краіне ёсць усё, чым можна ганарыцца і шанаваць, усё, каб гарманічна пражыць гэтае жыццё, — распавёў пра свой досвед вядзення акаўнта ў Instagram сенатар, на якога падпісаны, дарэчы, 15 тысяч чалавек, у асноўным — моладзь.

Не саромецца рабіць сэлфі на важных афіцыйных мерапрыемствах — прагучаў і такі рэцэпт цікавай падачы дзяржаўнай дзейнасці ад сенатара. Ён падкрэсліў, што сацсеткі дапамагаюць і ў вырашэнні хвалюючых пытанняў, якія паступаюць ад грамадзян.

— Ідэі, звароты і прапановы паступаюць перыядычна. За два гады актыўнай прысутнасці ў сацсетках не было пагрозлівых ці крытычных пасылаў у адрас органаў улады ці асабіста мяне. Наадварот, паступаюць словы падтрымкі. Ідэі, у тым ліку ад моладзі, заўсёды імкнуся трансфармаваць у дзеянні, прыцягнуць ініцыятараў да іх рэалізацыі. Ёсць і тыя, хто звяртаецца па дапамогу ў індывідуальным парадку, — адпраўляю запыты ў органы дзяржаўнай улады, — падзяліўся Віктар Лісковіч.

На сустрэчы аб тым, як сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі выкарыстоўваюцца моладдзю Гомельскага раёна, расказаў член Маладзёжнага парламента пры Нацыянальным сходзе Беларусі Станіслаў Сямёнаў. Малады чалавек — аўтар інтэрнэт-партала і мабільнага дадатку «Гомельскі раён у тваёй руцэ». Гэта праект стаў адным з пераможцаў першага абласнога конкурсу грамадзянскіх ініцыятыў Гомельскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў. Рэсурс не толькі знаёміць з жыццём раёна, але дапамагае вырашаць і канкрэтныя праблемы, з якімі анлайн звяртаюцца жыхары раёна.

— З пачатку года атрымалася вырашыць 30 зваротаў. Людзі звярталіся па самых розных пытаннях — ад усталявання кантэйнераў для збору смецця да дапамогі ў афармленні дзіцяці ў дзіцячы садок, — распавёў Станіслаў Сямёнаў.

Яго пазіцыя: пры кожным сельсавеце неабходна стварацьініцыятыўную маладзёжную групу, якая будзе дапамагаць у стварэнні і рабоце вясковых чатаў.

Карыстаючыся магчымасцю непасрэдна звярнуцца да моладзі раёна, Віктар Лісковіч акцэнтаваў увагу на некалькі цікавых ідэй. Прагучала прапанова, напрыклад, правесці маладзёжныя спаборніцтвы па азеляненні населеных пунктаў.

— Я ў Гомелі не першы раз і мяне заўсёды ўражвае багацце кветак. Але каб яны цешылі, неабходныя велізарная праца і клопат. Улады знаходзяць час і магчымасць стварацьпрыгажосць для сваіх гараджан. Кветкі — гэта гармонія ў гарадской атмасферы. Заўсёды ў Гомелі лаўлю сябе на думцы, наколькі мудра паступаюць улады горада, не шкадуючы сродкаў і сіл, каб праз кветкі паказваць пазітыў жыцця, — падзяліўся сенатар.

Ідэю па стварэнні маладзёжных зялёных зон адразу падтрымалі раённая арганізацыя БРСМ, Маладзёжны савет Гомельскага райсавета дэпутатаў і Маладзёжны савет раённага аб'яднання прафсаюзаў.

Ініцыятывы вясковай моладзі могуць садзейнічаць унутранаму турызму як драйверу развіцця сельскіх тэрыторый — з такім пасылам да моладзі раёна звярнуўся старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі.

— У кожным сельскім Доме культуры можна распрацаваць найбагацейшую музейную экспазіцыю. Моладзь, вазьміце на сябе рэалізацыю такой ідэі і прыцягніце да яе ўсіх школьнікаў раёна! — заклікаў Віктар Лісковіч. — А яшчэ з добрага савецкага мінулага мы забыліся, як важна абменьвацца паездкамі: паміж аграгарадкамі, сельсаветамі, раёнамі. Гэта аб'яднае і стане самай лепшай інфанагодай, пра якую вы зможаце цікава расказаць у сваіх сацсетках.

Таксама сенатар прапанаваў раённым органам улады запрашаць маладзёжных актывістаў браць удзел у прыёмах грамадзян.

— Работа вопытных кіраўнікоў — найлепшы прыклад для моладзі, — падкрэсліў Віктар Лісковіч.

Пасля сустрэчы парламентарый і маладзёжныя актывісты раёна наведалі мемарыяльны комплекс «Партызанская крынічка» і месца пошукавых работ у Чонкаўскім лесе. Таксама Віктар Лісковіч азнаёміўся з работай санаторыя «Чонкі», дзіцячага аздараўленчага летніка «Чонкаўскі бор» і ўнікальнай для раёна дзіцячай дашкольнай установы — ясляў-сада «Вясёлка-горад».

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

ЭКАНОМІКА, МОЛАДЗЬ І РОЛЯ ЖАНЧЫН У ГРАМАДСТВЕ

Міхаіл Русы сустрэўся з дэлегацыяй Ханты-Мансійскай аўтаномнай акругі

У Савеце Рэспублікі адбылася сустрэча старшыні Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаіла РУСАГА з дэлегацыяй Ханты-Мансійскай аўтаномнай акругі (Югры) на чале з Раманам ГЕНКЕЛЕМ, намеснікам губернатара. Падчас сустрэчы ўдзельнікі абмеркавалі шэраг аспектаў, якія датычацца беларуска-расійскага супрацоўніцтва. А гэта эканамічныя зносіны, патрыятычнае выхаванне моладзі, а таксама роля жанчын у развіцці грамадзянскай супольнасці.

Прадстаўнікі беларускай дэлегацыі засяродзілі ўвагу на тым, што развіццё праз рэгіёны — самы кароткі шлях дасягнення агульных мэт. Беларускі бок падкрэсліў, што адкрыты да новых прапаноў і супрацоўніцтва, а таксама гатовы падключацца па любым напрамку. Раман Генкель нагадаў, што ў рамках рэалізацыі 28 дарожных карт саюзнага супрацоўніцтва кіраўнікамі дзяржаў пастаўлена задача выхаду на адзіную энергасістэму. Удзяляецца ўвага пастаўкам прадуктаў харчавання, асабліва рыбнай прадукцыі. Пункты супрацоўніцтва назіраюцца і ў іншых сферах: культурнай, маладзёжнай, патрыятычнай.

— Гэты край унікальны і цікавы для нашай сумеснай працы. Але аб'ём тавараабароту, які існуе паміж намі, крыху нас не задавальняе, таму што кропак судакранання вельмі шмат. Калегам патрэбна, напрыклад, лесанарыхтоўчая тэхніка, транспарт, электробусы і тралейбусы на аўтаномным ходзе, велікагрузныя аўтамабілі, трактарная тэхніка, — сказаў Міхаіл Русы. — Гэты візіт праходзіць у вельмі ўдалы час: кіраўнікамі дзяржаў пастаўлена задача імпартазамяшчэння, і Беларусь можа ў нафтаразведкі, нафтаздабычы, новых і найноўшых тэхналогіях прапанаваць шмат з таго, што раней закуплялася Расіяй у краінах Захаду. Штогод у Югры праходзяць найбуйнейшыя міжнародныя мерапрыемствы, якія датычацца ІТ-тэхналогій. І наш Парк высокіх тэхналогій бачыць нямала кропак судакранання для сумеснага развіцця гэтага сектара эканомікі.

У сваю чаргу прадстаўнікі расійскай дэлегацыі адзначылі, што ў поўнай меры падтрымліваюць тэзіс, датычны эканомікі. Менавіта яна — сувязное звяно ў міжрэгіянальным узаемадзеянні. Эканоміка з'яўляецца кропкай росту патэнцыялу развіцця адносін паміж краінамі. Расійскі бок звярнуў увагу: агульная задача заключаецца не толькі ў тым, каб набываць беларускую прадукцыю, але і ў выбудоўванні доўгатэрміновага супрацоўніцтва. Напрыклад, праз стварэнне падраздзяленняў беларускіх кампаній у расійскіх рэгіёнах:

— У нас ужо адбылося некалькі сустрэч. Безумоўна, аснова нашага ўзаемадзеяння і супрацоўніцтва — гэта ў першую чаргу эканоміка, тыя прадпрыемствы, якім цікавы рынак Югры, — сказаў Раман Генкель. — У сваю чаргу нашы прадпрыемствы таксама зацікаўлены ў выхадзе на беларускі рынак. Мы ўжо адзначалі, што тыя лагістычныя ланцужкі, якія зараз змушана перапыніліся, — гэта ў першую чаргу магчымасці для кампаній заняць даныя нішы. І, самае галоўнае, заняць іх доўгатэрмінова. Тут наша мэта — не толькі і нават не столькі паглядзець прадукцыю, якая вырабляецца на тэрыторыі Беларусі, але яшчэ і выбудаваць каапэрацыйныя ланцужкі, каб прадпрыемствы маглі лакалізаваць у той ці іншай ступені, можа быць, адкрыццё сэрвісных цэнтраў, зборачных вытворчасцяў, ужо арганізаваць вытворчы працэс на тэрыторыі акругі.

Падчас сустрэчы прадстаўнікамі дэлегацый быў зроблены акцэнт і на патрыятычным выхаванні. Было адзначана, што моладзь прымае актыўны ўдзел у грамадскім жыцці, маладзёжны парламентарызм развіваецца на розных узроўнях. Актывісты з юнага ўзросту дэманструюць жаданне займацца дэпутацкай дзейнасцю, прапаноўваць розныя ініцыятывы. У якасці прыкладу супрацоўніцтва дзвюх краін быў згаданы патрыятычны праект «Цягнік Памяці», які аб'яднаў каля 200 дзяцей з розных рэгіёнаў Беларусі і Расіі. Удзельнікі сустрэчы паведамілі, што ў 2023 годзе «Цягнік Памяці» таксама адправіцца, падрыхтоўчая работа ўжо пачалася. Плануецца, што колькасць удзельнікаў павялічыцца.

Вынікам сустрэчы бакоў стала падпісанне пагаднення аб супрацоўніцтве паміж Беларскім саюзам жанчын і Еўразійскім аб'яднаннем жанчын — рэгіянальных лідараў. Удзельнікі сустрэчы адзначылі актыўную ролю жанчын у развіцці грамадскай супольнасці і дыпламатыі. У Беларусі і Расіі ёсць ініцыятыўныя людзі, гатовыя ўмацоўваць жаночую ролю ў грамадска-палітычным, культурным і эканамічным жыцці. Мэтай падпісання пагаднення стала аб'яднанне намаганняў і сумеснай работы, а таксама стварэнне камунікацый для абмену ведамі, вопытам і арганізацыяй агульных праектаў.

Арына КАРПОВІЧ.

ЁСЦЬ ПРАБЛЕМА — ЁСЦЬ І ВЫРАШЭННЕ

Да старшыні Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзіміра ЦЯРЭНЦЬЕВА на прамую тэлефонную лінію звярнуліся дзесяць чалавек. Адзін з іх спыніў кіраўніка дэпутацкага корпуса паўночнага рэгіёна яшчэ ў дарозе да рабочага кабінета. Віцябчанін, які пражывае на вуліцы Праўды, папрасіў дапамогі ў добраўпарадкаванні прыдамавой тэрыторыі: каля пад'езда ўтвараецца лужына, камунальнікі своечасова не прыбіраюць апалае лісце.

«Гэта жывы прыклад таго, што мы працуем з насельніцтвам штодзённа, а не толькі падчас прамых ліній. Раней за тры гадзіны паступала ад 24 да 30 зваротаў, сёння гэтая лічба знізілася да 10-12. Гэта паказчык таго, што праблемы, з якімі звяртаюцца людзі, вырашаюцца аператыўна і не патрабуюць паўторных званкоў», — пракаментаваў статыстыку зваротаў Уладзімір Уладзіміравіч.

Як і заўсёды, пытанні датычацца ЖКГ, стану дарог (асабліва ў населеных пунктах), транспарту. Жыхарка абласнога цэнтра паскардзілася на асабістую праблему, якая на працягу доўгага часу не можа вырашыцца. Ветэрана працы, што пражывае на вуліцы Лазо, турбуе... бяроза. Крона дрэва дарасла да вокнаў на трэцім паверсе, бясконцая праблема — лісце і бярозавыя пупышкі на балконе, а яшчэ — смецце ад птушак. Да жанчыны нават прыязджала мясцовае тэлебачанне, здымала сюжэт, але сітуацыя не змянілася. Не рэагуюць і санітарныя службы. Старшыня абяцаў прапрацаваць дадзенае пытанне, і калі на дрэве не будзе птушанят, спілаваць галіны, якія перашкаджаюць.

На вуліцы Дзімітрава, 9 востра стаіць пытанне забеспячэння вадой. У двухпавярховым доме, большасць жыхароў якога — пенсіённага ўзросту, некалькі дзён таму адсутнічала не толькі гарачая, але і халодная вада. Пашкоджаныя часам трубы не вытрымліваюць напору і выходзяць са строю. Ужо праз паўгадзіны пасля звароту жыхарам на першы час прывезлі тэхнічную і пітную ваду, а кіраўнік адміністрацыі Чыгуначнага раёна горада Віцебска Аляксей Героеў арганізаваў работу аварыйнай брыгады. Па аналагічным пытанні звярталіся і жыхары Шумілінскага раёна — з просьбай пабудаваць у вёсцы Гаравыя воданапорную вежу, бо свідравіна з цягам часу заілілася. Вядома, будаўніцтва — справа няхуткая і нялёгкая, але свідравіну ў кароткія тэрміны было даручана пачысціць.

Калектыўны званок да старшыні дэпутацкага корпуса вобласці паступіў з Віцебскага раёна. Жыхары вёскі Старое Замасточча звярнулі ўвагу на меліярацыйную канаву, якая праходзіць праз населены пункт і не абкошваецца. Сярод пустазелля «прапісаўся» яшчэ і небяспечны для людзей баршчавік. Пытанне было перададзена на кантроль старшыні раённага Савета дэпутатаў. У Глыбоцкім раёне лесавозы разбілі грунтавую дарогу, мясцовы жыхар прасіў пусціць грэйдар, што будзе выканана мясцовымі ўладамі ў хуткім часе. Але, як паказвае практыка, з надыходам восені пытанне стану дарог стане самым актуальным падчас прамых ліній і прыёмаў грамадзян.

Жыхарка паўночнай сталіцы звярнулася з праблемай транспартных зносін. У жанчыны ў горадзе Веліжы Расійскай Федэрацыі (гэта за 86 кіламетраў ад Віцебска) жыве радня, якую складана наведаць з-за адсутнасці аўтобуснага маршруту. У красавіку грамадзянка звярталася з просьбай стварыць маршрут Віцебск — Веліж, бо дабрацца да расійскага горада іншымі шляхамі немагчыма без асабістага аўтамабіля. На гэта атрымала адказ, быццам Масква не можа падрыхтаваць дакументы для афармлення рэйсаў, а яшчэ што такі маршрут нерэнтабельны. Пытанне ўзята на кантроль.

У жыхаркі Шумілінa, якая пражывае ў панэльным трохпавярховым доме, павышаная вільготнасць. Праз швы паміж панэльным пераскрыццем столі прасочваецца дождж, вясной — вада ад снегу. Дах не рамантуецца як мае быць, калі і ёсць спробы, яны не даюць плёну.

«Шмат зваротаў цяпер з Шумілінскага раёна — значыць, трэба добра прапрацаваць гэты напрамак. Раней з пытаннямі масава звярталіся з Оршы і Полаччыны, а цяпер інфраструктура Аршаншчыны стала лепшай. Практыка паказвае, што ў раённых Саветах дэпутатаў сёння працуюць прафесіяналы, з якімі мы разам аператыўна вырашаем пытанні, што хвалююць насельніцтва», — падсумаваў Уладзімір Цярэнцьеў.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.

АЛЕЯ МАЦЯРЫНСКАЙ СЛАВЫ

Як у Махроўскім сельсавеце працуюць над павышэннем прэстыжу мацярынства і сям'і наогул

Махроўскі сельсавет у многім асаблівы. І не толькі тым, што знаходзіцца сярод лясоў і балот на самай граніцы з Украінай, альбо, напрыклад, тым, што ў вайну, падчас акупацыі, не перапыняў сваёй работы. Галоўным багаццем гэтага краю, яго асаблівай прыкметай заўсёды былі шматдзетныя сем'і. Жанчыны традыцыйна нараджалі многа дзяцей. Яшчэ нейкія гады два таму ў дэмаграфіі населеных пунктаў назіралася станоўчая дынаміка.

Да таго ж вёска Махро — радзіма мастака Аляксея Кузьміча. І, значыць, многія яго Мадонны родам з гэтых мясцін. Што адразу кідаецца ў вочы на галоўнай плошчы населенага пункта — драўляная скульптура маці з двайняткамі-немаўляткамі на руках. А справа ад яе — на сцяне Дома культуры — вялікі інфармацыйны стэнд-шыльда нагадвае аб тым, што тут знаходзіцца карцінная галерэя Аляксея Кузьміча. Мадонны майстра — увасобленае ў мастацтве мацярынства — таксама вымушаюць асабліва ўважліва ставіцца да гэтай тэмы, што і робіць мясцовая ўлада.

Тут даўно ўжо выспявала ідэя нейкім чынам адзначыць подзвіг мацярынскага служэння. Менавіта так многія святары справядліва называюць цяжкую штодзённую мацярынскую працу. Дадатковы імпульс названая ідэя атрымала, можна сказаць, ад зваротнага, калі пачалі актыўна працаваць па 18-м Дэкрэце. Так, гаворка ідзе пра работу з нядбайнымі, праблемнымі сем'ямі.

— Дзяржава вельмі шмат робіць у плане падтрымкі шматдзетнай сям'і, — гаворыць **старшыня Махроўскага сельскага Савета Іван КУНАХАВЕЦ**. — А з нядбайнымі ды праблемнымі сем'ямі цяпер носяцца ўсе, на ўсіх узроўнях: задзейнічаны педагогі, медыкі, органы ўлады. Зараз, каб паставіць сям'ю ў СНС, на пасяджэнне збіраецца каардынацыйны савет на чале з намеснікам старшыні райвыканкама. Нехлямяжых бацькоў ушчуваюць, просяць, выхоўваюць. Не заўсёды праблема вырашаецца так, як належала б, бывае, даходзіць і да пазбаўлення бацькоўскіх правоў. Нярэдка, на жаль, даводзіцца назіраць пазіцыю яўных утрыманскіх адносінаў з боку шматдзетных бацькоў. Бывае, што ўзнікаюць пытанні і да тых сем'яў, у якіх знешне як быццам бы ўсё добра. Але калі бачыш маладую матулю з пляшкай піва, цыгарэтай і каляскай — становіцца ніякавата. Відаць, можна гаварыць пра пэўную адказнасць нашага пакалення за тое, што згубілі нешта важнае ў выхаванні. Неяк жа трэба выпраўляць гэтыя агрэхі.

Такім чынам, спачатку ў размовах спецыялістаў, потым на пасяджэннях сесій сельскага Савета паступова стала вымалёўвацца тэма арганізацыі дыялогавай пляцоўкі па праблематыцы прэстыжу мацярынства, адказнасці бацькоўства. Задумка была такая, што тут, у Махро, будуць збірацца эксперты з ліку навукоўцаў, педагогаў, спецыялістаў сацыяльнай службы, прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый, каб абмяркоўваць праблемы, агульнымі намаганнямі шукаць шляхі іх вырашэння. Ёсць намер прыцягнуць да работы таксама святароў розных канфесій, аўтарытэтных шматдзетных маці. Аўдыторыя будзе найбольш маладзёжная: старшакласнікі, будучыя бацькі і сямейнікі, маладыя сужэнцы і праблемныя сем'і.

Аўтары ідэі дапускаюць, што тыя ж каардынацыйныя саветы, дзе разглядаюць нядбайных бацькоў, можна праводзіць не ў райцэнтры, а тут. «Павадзіць гэтую мамку, што забылася на сваіх дзяцей, па нашай галерэі, паказаць карціны, музейныя матэрыялы, напрацоўкі па гісторыі мацярынскай славы нашых населеных пунктаў, — гаворыць Іван Кунахавец. — Калі з сотні хоць да адной дойдзе, абудзіць яе душу, сумленне, і тое можна лічыць станоўчым вынікам».

А гісторыя ў гэтым сэнсе ў Махро сапраўды слаўная. На тэрыторыі сельсавета за пасляваенны час больш за 50 матуль былі адзначаны галоўнай мацярынскай узнагародай — ордэнам. Раней узнагароду давалі за 10 і больш дзяцей, гэта апошнім часам можна атрымаць і за пяць.

— Глядзіце, пасля вайны бедна жылі, паесці напоўніцу не заўсёды выпадала, а сем'і вялікія былі, дзяцей нараджалі, — разважае Іван Іванавіч. — Першыя самыя невялікія дэкрэтныя грошы нашы мамы атрымалі ў 1964 годзе. А да гэтага ніхто і не думаў неяк заахвочваць матуль. І вось жа нараджалі, не думалі пра цяжкасці. Цяпер жа статыстыка сведчыць, што ў большасці сем'яў расце па адным дзіцяці.

Такім чынам, вымалёўваецца цэлы культурна-асветніцкі праект. Спачатку ў яго рамках нават разагналіся на дыхтоўны помнік — бронзавую скульптуру шматдзетнай маці. З такой прапановай звярталіся розныя інстанцыі, усюды праект у цэлым ухвалілі, але матэрыяльнай падтрымкі пакуль аказаць не змаглі. Ад ідэі наогул не адмовіліся, рэалізацыю яе вырашылі адкласці да лепшых часоў. А пакуль пры падтрымцы раённага выканкама, Савета дэпутатаў, раённага аддзела культуры зладзілі пленэр рэзчыкаў-скульптараў, якія з дрэва стварылі цэлую алею жаночых вобразаў.

У канцы мая гэтага года названы пленэр адбыўся. Рэзчыкі з розных рэгіёнаў краіны пад кіраўніцтвам Анатоля Туркова тыдзень шчыравалі ў Махро. Прафінансавалі мерапрыемства, можна сказаць, усёй талакой. Свой унёсак зрабілі прадпрыемствы, фермерскія гаспадаркі. Асноўным спонсарам выступіла ААТ «Машэраўскі». Алею скульптур вырашылі назваць «У славу маці». На алеі цяпер прадстаўлены дзяўчына-нявеста, жанчына-маці, шматдзетная маці, маці, якая смуткуе, жанчына-працаўніца, маці-Беларусь, жанчына будучыні і «Мадонна» Кузьміча.

Шматдзетная маці з немаўлятамі на руках і заняла сваё пачэснае месца на плошчы каля Дома культуры. Яна тут вельмі да месца, першай сустракае ўдзельнікаў любой тэматычнай імпрэзы. Так было, напрыклад, калі ў Махро праводзілася раённае свята, прымеркаванае да Міжнароднага дня абароны дзяцей.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

СВАЁ. РОДНАЕ

РЭХА ВАЙНЫ ПАД ШКЛОМ

У Оршы адкрылі новы ваенна-гістарычны музей імя Героя Савецкага Саюза Канстанціна Заслонава

Легендарны партызанскі камбрыг пакінуў у гісторыі Аршаншчыны яркі гераічны след, а гэтая зямля ўвекавечыла памяць Заслонава ў назве вуліцы, помніку і музеі. Яшчэ ў 1948 годзе ў Оршы быў створаны музей. Экспазіцыя размяшчалася ў дзвюх залах і мела тады не вельмі багатую прадметную базу. Потым змяніла прапіску, фонды папоўніліся новымі экспанатамі, якія дапамагалі збіраць былыя заслонаўцы, таварышы камбрыга і жыхары горада.

У 1994 годзе музей стаў філіялам Музейнага комплексу гісторыі і культуры Аршаншчыны, а ў 2016-м у выніку стыхійнай навальніцы будынак быў моцна пашкоджаны і яго знеслі. Толькі праз чатыры гады кіраўніцтва вобласці і горада вырашыла аднавіць музей. За год каля чыгуначнага вакзала з'явіўся новы двухпавярховы будынак з белай каланадай. На музейнай тэрыторыі ўсталявалі помнік у гонар загінулых у гады Вялікай Айчыннай вайны работнікаў раённага чыгуначнага бюро — ён захаваўся яшчэ з 60-х гадоў мінулага стагоддзя.

Галоўнай ідэяй, якая чырвонай ніткай праходзіць праз экспазіцыі ў шкляных вітрынах, з'яўляецца сіла патрыятызму нашага народа ў вайне і імкненне вызваліць Бацькаўшчыну ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Летапіс ваенных дзеянняў на тэрыторыі Аршанскага раёна ўдала спалучаны з гераічным шляхам Заслонава: як кадры з кінастужкі, экскурсаводы «гартаюць» мірнае жыццё і першыя гадзіны вайны, акупацыйны перыяд і Аршанскае гета, пакаранне падпольшчыкаў і раненне Канстанціна Сяргеевіча. У музеі знаходзіцца мультымедыйная ўстаноўка, якая ў анлайн-фармаце знаёміць наведвальнікаў з тэматычнымі блокамі, а яшчэ — 3D-карціна Аршанскага чыгуначнага вузла.

Сёння для экскурсантаў прадстаўлена звыш 500 арыгінальных экспанатаў з асноўнага фонду, а яшчэ шмат цікавых рэчаў знаходзіцца ў часовых выставах. Уклад у адраджэнне музея ўнесла Аршанская раённая пракуратура, якая прадставіла інфармацыйны стэнд, дзе адлюстраваны дакументальныя факты фашысцкіх зверстваў на Аршаншчыне, а яшчэ перадала музею электронны архіў дакументаў 1944—1946 гадоў.

«Адкрыццё ваенна-гістарычнага музея, які набыў другі лёс менавіта ў Год гістарычнай памяці, стала знакавай падзеяй. Гэта цаглінка памяці ў вялікі будынак гісторыі нашай Беларусі. Гэта памяць аб выдатным чалавеку, які тут жыў і змагаўся, аддаваў усяго сябе дзеля нашай агульнай будучыні. Знакава, што музей — гэта новы цэнтр ваенна-патрыятычнага выхавання моладзі, а кожны, хто яго наведае, зразумее: нам ёсць, чым ганарыцца. У нас вялікае мінулае і не менш вялікая будучыня», — адзначыў старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр СУБОЦІН.

У калекцыях прадстаўлены асабістыя дзённікі і рэчы заслонаўцаў, прадметы быту і архіўныя дакументы. Цяпер у зале часовых выстаў экспануецца выстава работ студыі ваенных мастакоў пры дзяржаўнай установе «Цэнтральны Дом афіцэраў Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», а яшчэ ў гэтым памяшканні плануецца правядзенне масавых мерапрыемстваў патрыятычнага кірунку.

«Мы ўзводзім не толькі спартыўныя і вытворчыя аб'екты, але і музеі, і манументы памяці. Гэта зроблена для таго, каб адлюстраваць сувязь пакаленняў і зберагчы яе для будучыні. Аб усім можна прачытаць, але важна ўбачыць і дакрануцца да жывой гісторыі, да таго, што адбывалася на нашай зямлі. Такім чынам, мы зберажом тое, што завяшчалі нам нашы прадзеды, і перададзім гэтую памяць моладзі», — рэзюмаваў **памочнік Прэзідэнта — інспектар па Віцебскай вобласці Анатоль ЛІНЕВІЧ.**

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.
Фота БелТА.

СПАС ЯБЛЫЧАК ПРЫПАС

У комплексным музеі «Гісторыя Заронаўскага краю», што ў Віцебскім раёне, традыцыі нашых продкаў жывуць не толькі на старонках падручнікаў. Абрадавыя святы беларусаў рэгулярна ладзяць захавальнікі музейных каштоўнасцяў разам з мясцовым Домам культуры, збіраючы разам прадстаўнікоў сталага і маладога пакалення.

